Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ЛІСТАПАДА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 214 (26327)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Міжнародныя кантакты

Беларусь зацікаўлена ў стабільным супрацоўніцтве з Латвіяй

Гэта падкрэсліў учора прэм'-ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, які знаходзіцца з візітам у сталіцы Латвіі. Кіраўнік беларускага Урада разам з прэм'ерам Латвіі Іварсам Годманісам узялі ўдзел у адкрыцці сёмай Нацыянальнай выставы Беларусі ў Латвійскай Рэспубліцы «Беларусь-ЭКСПА-2008».

Латвія, трэба заўважыць, — адзін з найважнейшых гандлёвых партнёраў нашай краіны. На працягу апошніх пяці гадоў захоўваецца станоўчая дынаміка беларуска-латвійскіх гандлёва-эканамічных адносінаў: паводле слоў Іварса Годманіса, беларускі экспарт у прыбалтыйскую краіну расце прыкладна на 25 працэнтаў у год.

Летась склаўся рэкордны ўзровень таваразвароту паміж Беларуссю і Латвіяй за апошнія 15 гадоў. Сярод знешнегандлёвых партнёраў Беларусі Латвія заняла 6-е месца па ўзроўні таваразвароту па-за СНД (пасля Нідэрландаў, Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі і Кітая) або 8-е месца сярод усіх краін, з якімі ажыццяўляецца знешні гандаль. Таваразварот вырас адразу на 95,7 працэнта і склаў $1 млрд 123 млн са станоўчым для нашай краіны сальда ў памеры $868,3 млн. Далейшаму ж развіццю кантактаў паміж нашымі дзяржавамі будзе спрыяць у тым ліку і правядзенне нацыянальных выстаў. Іварс Годманіс пацвердзіў, што «ёсць шэраг пытанняў у энергетыцы, якія мы маем намер абмеркаваць». Па словах латвійскага прэм'ера, супрацоўніцтва перспектыўнае найперш у дзвюх сферах: энергетычнай бяспецы і дыверсіфікаванні паставак энергарэсурсаў.

Кіраўнік латвійскага ўрада прызнаў, што перавалка беларускіх калійных угнаенняў праз латвійскія парты сёлета скарацілася, заўважыўшы, што «гэта — рынак». І сапраўды: латвійскі транзітны напрамак становіцца менш канкурэнтаздольным па тарыфах у параўнанні з літоўскім. Цяпер найважнейшым пытаннем аднаўлення аб'ёмных паказчыкаў транзіту беларускіх калійных угнаенняў з'яўляецца дасягненне дамоўленасцяў па паніжэнні тарыфных ставак па ўсім транспартным ланцужку, уключаючы чыгуначныя тарыфы, выдаткі па экспедыцыйным абслугоўванні і тарыфы кампаній па перавалцы грузаў у марскім порце. Адзначаючы гэта, прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі сказаў, што адказам на фінансавы крызіс можа быць толькі развіццё рэальнага таваразвароту: «Фінансавы крызіс паказаў усю згубнасць папяровай сістэмы, якая існуе ў свеце. Паказаў, што рэальная таварная вытворчасць будзе ў эканоміцы вызначальным фактарам». У гэтым кантэксце, паводле меркавання прэм'ера, найбольш важным з'яўляецца захаванне і развіццё экспартных рынкаў як для латвійскіх вытворцаў у Беларусі, так і для беларускіх вытворцаў у Латвіі. «Наша задача ў тым, каб гэтыя рынкі былі захаваныя і таварна-грашовыя патокі пераважалі над крызіснымі з'явамі, якія існуюць у сусветнай эканоміцы», — сказаў С. Сідорскі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Рыга.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Афармленне студні пад хатку на школьным двары ў вёсцы Цераблічы Столінскага раёна.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў дзяржузнагародамі дэпутатаў парламента трэцяга склікання

Прэзідэнт Беларусі адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу трэцяга склікання за плённую дзяржаўную і грамадскую дзейнасць, іх значны ўклад у развіццё заканадаўства і парламентарызму. Адпаведны ўказ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 10 лістапада.

Ордэна Пашаны ўдастоены Анатоль Салаўёў і Марыя Худая. Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны Святлана Гіль, Сяргей Забалоцец, Галіна Мазуркевіч, Уладзімір Малец і Пётр Саламуха. Віктару Герасімаву прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка прамысловасці Беларусі. За шматгадовую плённую работу, заслугі ў развіцці заканадаўства і парламентарызму медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны загадчык аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый Собалеў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прамая лінія

МЫ І НАШЫ ДЗЕЦІ

Аб усіх аспектах нашых узаемаадносінаў з дзецьмі можна будзе пагаварыць на «прамой лініі» з **галоўным пазаштатным спецыялістам па дзіцячай псіхіятрыі, асістэнтам кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі БДМУ, кандыдатам медыцынскіх навук Інай Віктараўнай ПЯТНІЦКАЙ.**

«Прамая лінія» адбудзецца **СЁННЯ з 16.00 да 17.00 па тэлефонах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.**

ПАЎТАРАГАДОВАЕ ДЗІЦЯ ЗАГІНУЛА НА ПАЖАРЫ Ў ПОЛАЦКІМ РАЁНЕ

Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні МНС Віцебскай вобласці.

Трагедыя адбылася пасля поўдня. Пажарныя, якія прыбылі на месца здарэння, аператыўна лакалізавалі і патушылі агонь. Аднак выратаваць жыццё хлопчыку, якога пакінулі без догляду ў доме, не ўдалося — малы атруціўся чадным газам. Як было ўстаноўлена, прычынай пажару стала самаробнае абагравальнае прыстасаванне ў выглядзе электратэна, пакладзенага на цагліны. У выніку яго работы адбылося ўзгаранне падлогі. 18-гадовая маці дала тлумачэнні, што з-за адсутнасці дроў яна ацяпляла дом такім чынам.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

ПРАЙДЗІСВЕТ АБКРАДАЕ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Тры падобныя злачынствы зафіксаваны ў Брэсце з пачатку лістапада. Зламыснік выманьвае грошы ў пажылых жанчын. Пры гэтым ён называе імёны іх блізкіх сваякоў, звычайна дзяцей, прадстаўляецца іх сябрам, затым расказвае, што купляе сыну ці дачцэ неабходныя тавары, на якія патрэбныя грошы. І даверлівыя пенсіянеркі раскрываюць кашалькі.

Яна СВЕТАВА.

ТЭРМІН ЗА ВУГРА

За незаконную здабычу вугра на тэрыторыі дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» і нанясенне прыродным рэсурсам урону ў асабліва буйным памеры судом Браслаўскага раёна ў дачыненні да браканьера прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на два гады ўмоўна. Урон у памеры больш за 4,3 мільёна рублёў парушальнік кампенсаваў добраахвотна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВАЎКІ НАПАДАЮЦЬ НА КУРЭЙ

У дачным пасёлку «Лясное» каля самага Пінска многія трымаюць курэй у гаспадарцы. Апошнім часам сюды панадзіліся хадзіць шэрыя драпежнікі. Яны такія дужыя, што рвуць металічныя петлі, якія ставяць гаспадары, ломяць агароджу і ўцякаюць у лес.

Яна СВЕТАВА.

Генадзь НЯВЫГЛАС: На слыху

«Колькасць білетаў, якія будуць распаўсюджвацца ў Барысаве, зменшыцца»

Білеты на матч Лігі чэмпіёнаў УЕФА паміж барысаўскім БАТЭ і мадрыдскім «Рэалам», які пройдзе 25 лістапада на мінскім стадыёне «Дынама», паводле папярэдняй інфармацыі, змешчанай на сайце Беларускай федэрацыі футбола, з'явяцца ў касах барысаўскага стадыёна і стадыёна «Дынама» 17 лістапада. Білеты будуць распаўсюджвацца «па старой схеме», паведамляецца на сайце.

Тым не менш, нагадаем, што афіцыйны сайт ФК БАТЭ размясціў зварот да балельшчыкаў, дзе выказвалася незадавальненне вялікай колькасцю фанатаў піцерскай каманды, якія невядомымі шляхамі набылі білеты і трапілі на матч паміж БАТЭ і «Зенітам». Выказвалася думка, што білеты і запрашальныя пропускі перапрадалі барысаўскія балельшчыкі, а гэта расцэньвалася футбольным клубам як «подлы ўдар у спіну». У звароце меркавалася, што на матч з «Рэалам» схема распаўсюджвання квіткоў будзе зменена. Растлумачыць, чаму змен не будзе і пракаментаваць сітуацыю з распаўсюджваннем білетаў мы папрасілі старшыню асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Генадзя Нявыгласа:

— Растлумачу сітуацыю, бо апошнім часам уводзяцца ў зман, у тым ліку і сродкі масавай інфармацыі. Правамі на распаўсюджванне білетаў валодае толькі адзін суб'ект — футбольны клуб БАТЭ. Ён заключыў дагавор з прадпрыемствам, якое заснавала наша асацыяцыя — «АБФФ-Падарожжа», яны і дыктуюць правілы распаўсюджвання білетаў. Гэта па-першае. Па-другое, вельмі многа заявак прыходзіць з рэгіёнаў, магчымасці набыць білеты ў касах у жыхароў іншых гарадоў няма. Па вопыту мінулага матча магу сказаць, што каля 4,5 тысячы білетаў было прададзена ў рэгіёны па заяўках, і гэта правільная практыка. У нас у краіне пражывае 9 з лішнім мільёнаў чалавек, і паглядзець матч на стадыёне маюць права ўсе. 25 тысяч білетаў на Мінск і Мінскую вобласць — гэтага дастаткова. Таму гэта схема будзе захаваная, БАТЭ, наколькі мне вядома, не збіраецца яе мяняць. Будзе зменшана колькасць білетаў, якія будуць распаўсюджвацца ў Барысаве, паколькі частка іх на мінулы матч нейкім чынам трапіла ў Пецярбург. Затое больш білетаў будзе прададзена ў Мінску. І ранейшая колькасць будзе распаўсюджана па заяўках, у тым ліку для рэгіёнаў. Зазначу, што ўпершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі ў жыхароў іншых населеных пунктаў з'явіўся рэальны шанц набыць білеты на сталічны футбол. Мы ўсе былі дзецьмі і ведаем, як складана было трапіць з рэгіёна на матчы. Усіх задаволіць, зразумела, не ўдасца.

Паводле рашэння ФК БАТЭ, білеты будуць даражэйшымі — самы дарагі будзе каштаваць 70 тысяч рублёў. А з нагоды таго, што наш футбол выклікае такі ажыятаж, трэба радавацца. Значыць ёсць прадукт, які ўсе хочуць набыць. Асобныя выпадкі спекуляцыі тут непазбежныя. Прывяду прыклад з «Зенітам»: з 20 тысяч білетаў на «Пятроўскі» на матч з БАТЭ ў свабодны продаж было пушчана ўсяго 3 тысячы. Гэта нармальная практыка, ва ўсім свеце не больш за 10 працэнтаў білетаў на такія матчы ідзе ў продаж. Астатнія прызначаны для ўладальнікаў абанементаў, спонсараў, партнёраў клуба і г.д. Паўтаруся, што гэта прадукт клуба, толькі ён прымае рашэнне, як яго распаўсюджваць.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЦЭНЫ НА БОЛЬШАСЦЬ СЕЛЬГАСПРАДУКТАЎ — СВАБОДНЫЯ

Напярэдадні

Паводле апошніх даных Мінсельгасхарча, сёлета аб'ём экспартных паставак беларускага харчавання перавысіў 1,2 мільярда долараў. Гэта на 36 працэнтаў больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Як адзначыў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра, узровень вытворчасці дазваляе не толькі поўнасцю задавольваць патрэбы ў сельскагаспадарчай прадукцыі, але і пэўную частку пастаўляць за мяжу. У грамадскім сектары АПК аб'ём сельскагаспадарчай вытворчасці ў параўнанні з мінулым годам павялічыцца на 11,5—12 працэнтаў. А вось у прысядзібных гаспадарках адбудзецца скарачэнне: сёлета на 17 тысяч паменшала падворкаў вяскоўцаў, на 50 тысяч галоў «згарнуўся» прыватны статак.

Вытворчасць малака дасягнула 6 мільёнаў тон, з якіх палову магчыма адпраўляць на экспарт. Але неабходна гандляваць пераважна гатовай прадукцыяй, а не сыравінай. Дазвол на вываз у Расію невялікіх партый малака ў цыстэрнах атрымалі толькі 5-6 перапрацоўчых прадпрыемстваў. Астатнія павінны нарошчваць пастаўкі масла, сыроў, сухога і пастэрызаванага малака і г.д. Тым больш што на адпаведную прадукцыю пастаянна вялікі попыт, які ўзрастае з года ў год.

Як растлумачыў Сямён Шапіра, патрэба Расіі ў малацэ і малакапрадуктах складае каля 37 мільёнаў тон, унутраныя вытворцы здольныя забяспечыць 31 млн тон Астатняе ім неабходна завозіць. Беларусь становіцца заўважным удзельнікам на расійскім рынку. Узровень якасці айчыннай мясамалочнай прадукцыі адзін з самых высокіх не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў Еўропе. Паводле слоў Сямёна Шапіры, для вытворчасці выкарыстоўваецца натуральная сыравіна — да прыкладу, малочная прадукцыя вырабляецца толькі з натуральнага малака. У шэрагу краін для гэтых патрэбаў выкарыстоўваецца сухое. Таму ў той жа Расіі ўнесены змяненні ў стандарты і ў такім разе прадукцыя павінна будзе называцца «малочны напой».

Прэтэнзіі да беларускай прадукцыі з боку Рассельгаснагляду, на думку Сямёна Шапіры, у першую чаргу звязаны не з якасцю, а з неабходнасцю правядзення належнай тэхнічнай мадэрнізацыі на айчынных прадпрыемствах перапрацоўкі. Зараз набываецца ўсё неабходнае абсталяванне, каб правадзіць паўнаважкі аналіз па ўсіх пазіцыях (у прыватнасці, адна з заўваг расійскага боку — магчымая наяўнасць у гатовай прадукцыі рэшткаў медыцынскіх сродкаў, якія прымяняліся для лячэння жывёл). З іншага боку, каля 13 працэнтаў нашага ўнутранага рынку малочнай прадукцыі прыпадае на расійскіх вытворцаў, у дачыненні да якіх беларускімі структурамі плануецца правесці праверкі на адпаведнасць нарматыўным патрабаванням. «Мы мяркуем прыняць адэкватныя меры да расійскіх вытворцаў і знайшлі параўнанне ў расійскіх калег, якія лічаць, што неабходна разам наводзіць парадак», — заўважыў Сямён Шапіра.

Увогуле прадукты харчавання за мяжу пастаўляюць 122 беларускія прадпрыемствы. Як адзначаюць у Мінсельгасхарчы, на экспарт павінны працаваць пераважна буйныя вытворцы. Толькі такія прадпрыемствы будуць здольныя заваяваць свой сегмент на рынку і належным чынам яго захоўваць і павялічваць. Як паведаміў Сямён Шапіра, у бліжэйшы час мяркуецца разгледзець пытанне аб больш глыбокай інтэграцыі рынкаў сельскагаспадарчай прадукцыі Беларусі і Расіі. Таксама будзе ўдакладнена квота адпавядных паставак на рынак РФ.

У бліжэйшы час, магчыма, адбудуцца пэўныя змяненні ў структуры дзяржаўнага кіравання аграпрамысловым комплексам. У прыватнасці, паведаміў Сямён Шапіра, падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы аб стварэнні Белсельгаснагляда. Па аналогіі з адпаведнай расійскай структурай у беларускага падраздзялення павінны быць шырокія паўнамоцтвы і функцыі ў сферы нагляду. Канчатковае рашэнне будзе прынятае пасля ўзгаднення такой мадэрнізацыі структуры АПК з усімі зацікаўленымі. Таксама плануецца мадэрнізаваць і гаспадарчую структуру ўпраўлення. Да прыкладу, стварыць шэраг прадуктовых кампаній, якія былі б не толькі здольныя каардынаваць той ці іншы накірунак, але і выходзіць ад адной асобы на знешні рынак.

Закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю ў суседніх дзяржавах на парадак вышэйшыя, чым у Беларусі. Калі не адсочваць сітуацыю, лічыць Сямён Шапіра, можна «згубіць» значную частку сыравіны, якая так неабходная вытворцам. Таму сёлета было прынятае рашэнне аб павышэнні закупачных цэнаў. Адэкватнага павелічэння оптава-адпускных цэнаў тады не адбылося. Іх плануецца «падцягнуць» да канца гэтага года: на малочную прадукцыю — на 2,5 працэнта, на ялавічыну — на 5, на свініну — на 8. Такім чынам, заўважыў Сямён Шапіра, удасца падтрымаць айчыннага вытворцу. Увогуле, па словах міністра, на большасць сельскагаспадарчай прадукцыі — свабодныя рынкавыя цэны. У разрадзе рэгулюемых пазіцый засталіся толькі мяса-малочныя прадукты, а таксама збожжа, якое закупляецца ў лік дзяржзаказу.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«Сябрына» — да свята

У Брэсце прайшоў урачысты вечар з нагоды 90-гадовага юбілею сістэмы «Саюздрук». Напачатку віноўнікі ўрачыстасці трымалі невялікую справаздачу перад гасцямі. І аказалася, што насуперак распаўсюджанаму меркаванню, што зараз газет і часопісаў чытаць сталі менш, іх запатрабаванасць выросла. Калі 15 гадоў таму «Брэстаблсаюздрук» прадаваў за год прыкладна 2 мільёны экзэмпляраў выданняў, то цяпер — 11-12 мільёнаў.

Як паведаміў дырэктар прадпрыемства Васіль Марэйка, дарэчы, у мінулым уласны карэспандэнт нашай газеты, сёння брэсцкі «Саюздрук» мае ў вобласці 156 кіёскаў і спецыялізаваныя магазіны. А нядаўна адкрыты новы магазін «Сябрына» як увасабленне новых тэхналогій рэалізацыі прэсы. У «Сябрыне» не толькі прасторная гандлёвая зала, але ёсць канферэнц-зала, невялікае кафэ і месца для работы на камп'ютары. Калі абнавілі па-сучаснаму магазін «Прэса» ў цэнтры Брэста, то продаж перыёдыкі павялічыўся там з 2 мільёнаў рублёў да 17. Цяпер паступова праводзіцца мадэрнізацыя сістэмы гандлю і ў раёнах.

На ўрачыстым сходзе міністр інфармацыі рэспублікі Уладзімір Русакевіч горача павіншаваў работнікаў «Брэстаблсаюздруку» са святам, а лепшым уручыў ганаровыя граматы і знакі «Выдатнік друку Беларусі». Ганаровай граматай Савета Міністраў краіны быў адзначаны Васіль Марэйка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 6 (шести) газотурбинных двигателей НК-12СТ. Начальная стоимость снижена на 20 % и составляет – 2 162 500 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2008 г. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий и сооружений по адресу: г. Климовичи, ул. Железнодорожная, 32, в том числе: корпус мастерской (429,5 кв.м), материальный цех (419,9 кв.м), административное здание (48,9 кв.м), котельный цех (общ. пл. 7,8 кв.м), забор металлический, ворота въездные. Пл. зем. участка 1,8287 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет – 199 437 849 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2008 г. Аукцион состоится **02.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.11.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 132,00
1 еўра	2 676,30
1 латвійскі лат	3 772,78
1 літоўскі літ	775,09
1 чэшская крона	105,69
1 польскі злоты	713,54
1 расійскі рубель	77,61
1 украінская грыўня	369,18

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	27,4704
10 UAH	34,6319
1000 BYR	12,9976
EUR	47,4856

Курс у гандлёвых кампаніях (на 12.11.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

На гэтым тыдні трэба разлічыцца за нерухомасць

Фізічныя асобы, у карыстанні, валоданні, уласнасці якіх знаходзяцца зямельныя ўчасткі, жылыя дамы, дачы, садовыя домікі і іншыя пабудовы, павінны заплаціць зямельны падатак і (або) падатак на нерухомасць за 2008 год, паведамілі рэдакцыі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Спецыялісты МПЗ удакладнілі, што апошні тэрмін платы маёмасных падаткаў для жыхароў нашай краіны — 15 лістапада. Згодна з дзеючым заканадаўствам, падаткі гаспадары нерухомасці павінны плаціць па месцы знаходжання аб'ектаў падаткаабкладання. Падаткавікі звяртаюць увагу на тое, што за кожны дзень пратэрміноўкі прадугледжваецца налічэнне пені. За нявыплату ці няпоўную плату маёмасных падаткаў фізічнай асобай прадугледжаны штраф у памеры 15 працэнтаў ад сумы нявыплачаных падаткаў, але не менш за адну базавую велічыню.

Сяргей КУРКАЧ.

«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ, ЧТО 26 НОЯБРЯ 2008 ГОДА СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА

Собрание состоится в г. Минске по адресу: ул. В. Хоружей, 31А в 09.00.

Регистрация участников будет осуществляться с 08.30 до 08.50. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении результатов проведения закрытой подписки на акции «Приорбанк» ОАО одиннадцатого выпуска.
2. О выпуске акций «Приорбанк» ОАО одиннадцатого выпуска.
3. Об увеличении уставного фонда «Приорбанк» ОАО.
4. О внесении изменений в Устав «Приорбанк» ОАО.

Наблюдательный Совет
Правление «Приорбанк» ОАО

Лицензия НБ РБ № 12 от 28.08.08 г.

Асуджана злачынная група, якая выкрадала грошы з банкаматаў з дапамогай «ліванскай пятлі»

Пра гэта паведаміў журналістам начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі Ігар Чарненка. Ён нагадаў, што махляры (6 чалавек) дзейнічалі ў Мінску, Маладзечне, Бабруйску і іншых гарадах краіны. Пры выкраданні грошай яны выкарыстоўвалі «ліванскую пятлю» — спецыяльную прыладу для блакавання пластыкавых картак у карткапрыёмніках банкаматаў.

БЕЛТА.

Белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 21 НОЯБРЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 12 ноября 2008 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк».

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 19 ноября 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 30 ноября 2008 года.

Телефоны для справок: 8 (017) 250 60 01, 228 53 00.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БелСТ, Velcom, МТС) - по тарифам оператором мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УКРАІНСКІЯ ДЭПУТАТЫ АДПРАВІЛІ Ў АДСТАЎКУ СПІКЕРА ВЯРХОЎНАЙ РАДЫ

Дэпутаты Вярхоўнай Рады Украіны адправілі ў адстаўку спікера парламента Арсенія Яцянюка. За адкліканне спікера прагаласавалі 233 парламентарыі пры неабходным мінімуме ў 226 галасоў. Адзначым, што за дзень да гэтага ў парламентарыяў не атрымалася набраць неабходную колькасць галасоў для зняцця Яцянюка з пасады спікера.

Незадоўга да галасавання аб адстаўцы Яцянюка парламентарыі адхілілі спікера Рады ад вядзення пленарных пасяджэнняў на два дні. Месца Яцянюка часова заняў першы віцэ-спікер Аляксандр Лаўрыновіч, дэпутат ад Партыі рэгіёнаў. Пасля гэтага, па інфармацыі РІА «Новости», у парламенце адбылася бойка дэпутатаў Блока Юліі Цімашэнкі і апазіцыйнай Партыі рэгіёнаў. Адбыліся чарговыя непаладкі ў электроннай сістэме галасавання.

Пытанне аб адстаўцы Яцянюка было занесена ў парадак дня Вярхоўнай Рады 11 лістапада па патрабаванні дэпутатаў ад Партыі рэгіёнаў. Яе члены абвінавацілі спікера парламента ў падробцы і парушэннях рэгламенту.

РАСІЯ МОЖА РАЗМЯСЦІЦЬ СВАЕ «ІСКАНДЭРЫ» І Ў БЕЛАРУСІ?

У рамках стварэння сумеснай з Беларуссю сістэмы проціпаветранай абароны ў рэспубліцы можа быць разгорнутая расійская брыгада. Аб гэтым заявіў дырэктар па адмысловых даручэннях ФДУП «Рособоронэкспорт» Мікалай Дзімідзюк у сераду журналістам у Маскве.

Адказваючы на пытанне аб магчымасці экспартных паставак у Беларусь ракетных комплексаў «Іскандэр», якія прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў прыстрашыў размясціць у Калінінградскай вобласці РФ у адказ на разгортванне ПРА ЗША ў Еўропе, Дзімідзюк сказаў, што комплексы павінны быць пастаўленыя спачатку ў войскі РФ, і паміж іх прыёмам на ўзбраенне расійскай арміі і экспартнымі пастаўкамі за мяжу «будзе пэўная паўза». Пры гэтым ён адзначыў, што абмежаванняў на пастаўку расійскіх узбраенняў у Беларусь няма.

ПАСЛЯ ПЕРАМОГІ АБАМЫ АМЕРЫКАНЦЫ СТАЛІ ЗАПАСАЦЦА ЗБРОЯЙ

Пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія прайшлі 4 лістапада, у Злучаных Штатах сталі купляць нашмат больш агнястрэльнай зброі.

Амерыканцы асцерагаюцца, што новая адміністрацыя абмяжуе іх права на валоданне зброяй. Акрамя таго, некаторыя пакупнікі баяцца беспарадкаў у сувязі з эканамічным крызісам.

ПОЎНЫ ЗБОР КАТАЛІЦКІХ БОГАСЛУЖЭБНЫХ ТЭКСТАЎ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ БУДЗЕ ВЫДАДЗЕНЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС

Аб гэтым паведаміў Архіепіскап Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

Паводле яго слоў, усе пераклады ўжо зроблены і адобраны Ватыканам. Акрамя таго, у будучым годзе плануецца ажыццявіць выданне перакладзеных на беларускую мову дакументаў II Ватыканскага сабора. «Для каталіцкай царквы ў Беларусі гэта вельмі важна, таму што мы жывём у догмах II Ватыканскага сабора, — падкрэсліў Тадэвуш Кандрусевіч. — Поўны пераклад ужо выкананы, і мы пачынаем падрыхтоўку да выдання». Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі нагадаў, што 2008 год — вельмі плённы ў справе выдання каталіцкай літаратуры. Выдавецтвам Procristo выпушчана ў гэтым годзе 26 кніг. Асаблівай увагі заслугоўвае выхад у свет каталіцкага катэхізіса для дзяцей на беларускай мове.

БЕЛТА.

Фінансы

Нацбанк не чакае істотнага росту ставак па крэдытах пасля павышэння стаўкі рэфінансавання

Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль Драздоў. З 12 лістапада стаўка рэфінансавання павялічылася на 0,25 працэнтнага пункта да 11 працэнтаў гадавых. «У асобных банках працэнтныя стаўкі па крэдытах ужо дайшлі да гранічнага ўзроўню», — сказаў ён.

Відавочна, што павышэнне закране ў большай ступені тыя стаўкі, якія непасрэдна прывязаны да ўзроўню стаўкі рэфінансавання. Шэраг банкаў па такой схеме сёння разлічвае кошт выдаваемых рэсурсаў. Напрыклад, у Беларусбанку ад стаўкі рэфінансавання непасрэдна залежыць працэнтная стаўка толькі па аднаму віду крэдыту. Стаўкі па іншых крэдытах Беларусбанк пакуль што павышаць не мае намеру.

Крэдытаатрымальнікі перад заключэннем дагавора павінны ўважліва азнаёміцца з яго ўмовамі, вывучыць, у якіх выпадках банк можа павысіць стаўку і вызначыць, ці падыходзяць такія ўмовы для іх.

Рашэнне аб павелічэнні стаўкі рэфінансавання было прынята Нацбанкам з-за таго, што існуючы ўзровень інфляцыі ў краіне істотна перасягае прагнозныя значэнні. «У існуючай сітуацыі трэба захаваць зберажэнні грамадзян ад абясцэньвання, а павышэнне стаўкі рэфінансавання дасць магчымасць гэта зрабіць», — растлумачыў Анатоль Драздоў.

Павышэнне ўзроўню стаўкі рэфінансавання, а адпаведна і працэнтнай стаўкі па ўкладах, стане стымулюючай мерай для прытоку зберажэнняў у банкі. У сваю чаргу гэта станоўча адаб'ецца на пашырэнні іх рэсурснай базы і магчымасцях па задавальненні попыту насельніцтва і прадпрыемстваў на банкаўскія паслугі. Нацыянальны банк і ў далейшым мае намер падтрымліваць узровень працэнтных ставак, які садзейнічае росту ўкладаў насельніцтва і арганізацый у банках.

Як паведамлялася раней, з-за існуючай сітуацыі на фінансавым рынку да канца 2008 года стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі можа быць павялічана да 14 працэнтаў.

Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2009 год стаўка рэфінансавання закладзена ў межах 10-12 працэнтаў гадавых пры прагназуемым узроўні інфляцыі (9-11 працэнтаў) і курсу беларускага рубля.

БЕЛТА

Банкі з 1 студзеня 2009 года будуць абавязаны агучваць рэальную эфектыўную працэнтную стаўку па крэдытах

Аб гэтым заявіў член Савета дырэктараў Нацыянальнага банка, начальнік галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду Сяргей Дубкоў на трэцяй міжнароднай канферэнцыі «Рознічныя банкаўскія паслугі: тэндэнцыі і перспектывы».

«Прааналізаваўшы вопыт, скандальныя сітуацыі ў нашых суседзяў па пытанні разліку эфектыўнай працэнтнай стаўкі, Нацыянальны банк Беларусі падрыхтаваў адпаведную інструкцыю, дзе будзе прапісана формула эфектыўнай працэнтнай стаўкі», — сказаў ён.

Патрабаванне аб абавязковым абвяшчэнні эфектыўнай працэнтнай стаўкі па крэдытах для беларускіх банкаў плануецца ўвесці з 1 студзеня 2009 года.

Паводле слоў Сяргея Дубкова, апошнім часам прынята лічыць, што ў параўнанні з працэнтнай стаўкай графік плацяжоў з'яўляецца больш інфарматыўным паказчыкам для фізічных асобаў, «паколькі зарплату мы атрымліваем у рублях, а не ў працэнтах».

Людміла САЦ, БЕЛТА.

ДЗЕНЬ ПРЫМІРЭННЯ — ЗНАКАВЫ ДЗЕНЬ

Першая сусветная вайна мела глабальныя наступствы для ўсяго свету. Па-першае, зніклі з карты планеты чатыры імперыі, а па-другое, тая вайна справакавала Кастрычніцкую рэвалюцыю, пасля якой свет змяніўся ў палітычным, эканамічным і сацыяльным плане.

Але з часам Першая сусветная пачала забывацца, і вось праз 90 гадоў пра тую вайну ўспомнілі і 11 лістапада (дзень падпісання мірнага пагаднення) у Баранавіцкім раёне прайшло мерапрыемства, прысвечанае той падзеі.

Прадстаўнікі мясцовай улады, Міністэрства абароны, пасольстваў і замежныя госці сабраліся на нямецкіх вайсковых могілках каля г. п. Гарадзішча памянуць палеглых у тую вайну. Былі ўскладзены вянкі ад Беларусі, Расіі і Германіі, святары трох канфесій адслужылі малебен, паветра ўскалыхнулі залпы...

А затым падзеі развіваліся на 228-ым кіламетры аўтамагістралі Брэст — Мінск. Побач з дарогай знаходзіцца дзот тых часоў, і каля яго ваенна-патрыятычныя клубы паказалі эпізод бітвы забытай вайны.

У атаку ішлі «нямецкія салдаты», якія прыехалі з Масквы і Брэста, а адбівалі іх наступленне «рускія» з Гомеля. Стаяла моцная страляніна, а калі закончыліся «патроны», «немцы» і «рускія» пад апладысменты прысутных пачалі братацца.

А пасля адкрылі невялікі памятны знак, прысвечаны Дню прымірэння. Салдаты Ганаровай варты ўсклалі да яго вянкі. Была хвіліна маўчання... Усе разам сфатаграфаваліся ды пайшлі да палаткі, каля якой дымілася палявая кухня з кашай.

На гэтым мерапрыемстве прыцягнуў да сябе ўвагу Аляксандр Бісмарк — праўнук знакамітага канцлера Ота Бісмарка. Ён аказаўся даволі камунікабельным чалавекам і ахвотна адказваў на пытанні.

Княгіні Наталлі ГАЛІЦЫНАЙ усё да твару.

— Мой прадзед падпісаў з расійскім царом дамову, але германскі імператар пайшоў іншым шляхам. А ўвогуле вайна — гэта не той спосаб, якім дабіваюцца міру. Трагічныя моманты гісторыі нельга забываць.

Салдаты Першай сусветнай.

А. БІСМАРК з шабляй.

— Асабіста ў вас тая вайна якія выклікае пачуцці?

— Я чалавек абсалютна мірны — займаюся бізнэсам. А кожны прадпрымальнік ведае, што найлепш справы ідуць, калі паміж людзьмі ёсць давер. Адсюль і пачуцці.

— А як вы ставіцеся да Расіі — краіны, з якой у мінулым стагоддзі Германія двойчы ваявала?

— Жонка ў мяне руская, дарэчы, мне вельмі прыемна, што менавіта сёння ў яе дзень нараджэння. Мой бізнэс таксама і ў Расіі, і гэтым усё сказана.

— Ваша знакамітае прозвішча дапамагае ў жыцці?

— Пры знаёмстве людзі ставяцца добра — ім цікава, і тут ёсць пэўны плюс, але калі справа датычыцца дзелавых адносінаў — бізнэсу, то ўжо прозвішчам не прыкрыешся.

— Што думаюць пра Беларусь у вашай краіне?

— На жаль, у Германіі яшчэ няшмат ведаюць пра Беларусь — мала інфармацыі.

11 лістапада быў зроблены першы крок, каб паглядзець на гісторыю з іншага боку — нам таксама не вельмі шмат вядома. Мы доўгі час жылі ў свеце, падзеленым на сваіх і чужых.

Сціплы памятны знак, не ўсе моманты мерапрыемства былі бездакорна адпрацаваныя, але ў цэлым — гэта падзея знакавая. Яшчэ колькі гадоў назад у такое нельга было паверыць — сапраўдны Дзень прымірэння.

Беларусь адкрываецца свету як цывілізаваная краіна. І хоць мы ахвяры (з якога боку ні паглядзіш) Першай сусветнай, але той факт, што нямецкім салдатам, пахаваным у нашай зямлі, былі аддадзены высокія воінскія ўшанаванні, гаворыць пра многае. Наша грамадства мяняецца, далучаецца да еўрапейскай супольнасці, да агульначалавечых каштоўнасцяў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Каля памятнага знака.

ДВОЕ БРАСТАЎЧАН АСУДЖАНЫ ЗА ЗМЯНЕННЕ IMEI-НУМАРОЎ СКРАДЗЕНЫХ СОТАВЫХ ТЭЛЕФОНАЎ

Аб гэтым паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі.

Да парушэнняў аўтарскіх правоў у сферы інфармацыйных тэхналогій адносяцца мадыфікацыі IMEI-нумароў сотавых тэлефонаў і стварэнне ў сетцы інтэрнэт сайтаў-дублікатаў, якія выкарыстоўваюць чужую папулярнасць. Двое брастаўчан мянялі IMEI-нумары скрадзеных мабільных. Яны прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Тым самым створаны судовы прэцэдэнт пакарання за такія правапарушэнні.

БЕЛТА.

Эх, яблычак...

Спажывец

У карысці для здароўя ўжывання садавіны і ў прыватнасці яблыкаў не хоча пераконвацца, бадай, толькі лянівы. Такое ўражанне застаецца пасля наведвання гродзенскіх рынкаў, якія ўвосень прапануюць даволі шырокі асартымент гэтай вітаміннай прадукцыі, у асноўным менавіта яблыкаў.

Ёсць на прылаўках і імпартныя яблыкі па цане каля трох тысяч рублёў за кілаграм і вышэй, і з нашых садоў (адна-дзве тысячы рублёў). Праўда, усё гэта трэба ўжываць ў бліжэйшы час. А вось яблыкаў позніх гатункаў, якія б захоўваліся да вясны, убачыць не ўдалося. І што ж рабіць тым, хто не вырашае гэта пытанне на ўласным прысядзібным участку?

Сітуацыя быццам і не тупіковая. «У мяне ёсць яблыкі, якія будуць ляжаць аж да лета», — абнадзейвае адна гандлярка. Якая цана? Цяпер, кажа, паўтары тысячы за кілаграм, а зімой будзе прадаваць за тры.

Тэлефаную ў СВК «Азёры» Гродзенскага раёна. Можна прыехаць туды і купіць яблыкі, аднак да вясны яны не захоўваюцца, толькі да Новага года. Такая ж сітуацыя і ў сельгаскааператывах «Прагрэс-Верцялішкі» і «Кастрычнік-Гродна». Яблыкі позніх гатункаў закладзеныя на адказнае захоўванне і пойдуць у рэалізацыю ўжо ў наступным годзе. Зразумела, значна даражэй, чым у перыяд масавага збору плёнкі. Да прыкладу, адпускныя цэны на яблыкі ў СВК «Кастрычнік-Гродна» ў студзені—сакавіку сёлета былі больш чым удвая вышэйшымі ў параўнанні з верасенем—кастрычнікам 2007 года. Дадатковая выручка прадпрыемства ад іх рэалізацыі ў больш позняя тэрміны склала 2,5 мільярда рублёў.

Пры гэтым пакупніку далёка не заўсёды трэба шкадаваць аб страчанай выгадзе. Так, восенню можна атаварыцца танней, чым зімой. Аднак ці здолееце вы ў гаражы ці нейкім іншым памяшканні забяспечыць такія ж умовы, як на сучасных сховішчах вышэйпамянёных сельгаспрадпрыемстваў? І ці не перавысяць страты прадукцыі розніцу ў восеньскіх і зімовых цэнах?

Дарэчы, сітуацыя ў пладаводстве была нядаўна вывучана Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці. І адна з ключавых праблем — менавіта стварэнне належных умоў для захоўвання садавіны. На сёння ўведзеныя ў эксплуатацыю толькі чатыры пладасховішчы з пятнаццаці, прадугледжаных дзяржаўнай мэтавай праграмай. З-за несвоечасовага вырабу праектна-каштарысной дакументацыі, парушэння графіка фінансавання і будаўніцтва зрываецца запланаваны на сёлета ўвод гэтых аб'ектаў у СВК «Пагранічны» Гродзенскага раёна і ў РСУП «Эксперыментальная база «Руткевічы» Шчучынскага раёна. А ў пладасховішчы СВК «Агра-Лозы» Ваўкавыскага раёна ад работы кандыцыянераў на падлозе камер утвараецца вялікая колькасць вады, адвод якой праектам... не прадугледжаны.

Выкананне на Гродзеншчыне праграмы па будаўніцтве альбо рэканструкцыі пладасховішчаў дазволіла б атрымаць каля 8,5 мільярда рублёў дадатковай выручкі ад рэалізацыі пладоў у больш позні перыяд. Што ж датычыцца ўражаю садавіны, то, на першы погляд, дэфіцыту быць не павінна. Пладова-ягадныя культуры, паводле статыстычных звестак, растуць ажно ў 136 сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці. Ды толькі ў большасці гаспадарак яны не выкарыстоўваюцца і падлягаюць раскарчоўцы. Рэальна садоўніцтвам займаюцца толькі 23 прадпрыемствы, а з улікам фермерскіх гаспадарак — 29. Прычым не заўсёды на сучасным узроўні. Праверкі паказалі, што ў шэрагу выпадкаў прамысловыя сады закладваюцца без праектна-каштарыснай дакументацыі, не праводзяць інвентарызацыю садоў на прадмет іх прадукцыйнасці, марфалагічнага і фітасанітарнага стану, не ажыццяўляецца належны догляд культур.

Да прыкладу, у СВК «Невяровічы» Ваўкавыскага раёна з-за несвоечасовай апрацоўкі гербіцыдамі прыствольныя палосы яблыневага саду на момант праверкі зараслі пустазеллем, што адаб'ецца на ўраджайнасці і ў наступным годзе. Такая ж сітуацыя і ў СВК «Дзярэчын-Агра» Зэльвенскага раёна. А ў Слонімскім дзяржаўным аграрным каледжы сельскагаспадарчай вытворчасці сад да цяперашняга часу наогул не закладзены. Хоць яшчэ пазалетась было затрачана 10 мільёнаў рублёў бюджэтных сродкаў на набыццё сеткі для агароджвання саду. Сетка знаходзіцца на складзе, а аб уключэнні гэтай установы ў рэспубліканскую праграму развіцця пладаводства дырэктар даведаўся толькі ад правяраючых.

Такім чынам, у пладова-ягаднай галіне працы наперадзе непачаты край. Агульны валавы збор гэтай прадукцыі на Гродзеншчыне складае крыху больш за палову ад існуючай патрэбнасці, прычым доля сельскагаспадарчых і іншых арганізацый — усяго 23,6 працэнта. У выніку толькі за дзевяць месяцаў гэтага года імпартавана больш за 11 тысяч тон яблыкаў на суму 7,4 мільёна амерыканскіх долараў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Каментарый аб парадку індэксацыі даходаў насельніцтва Беларусі за кастрычнік 2008 года

Грашовыя даходы насельніцтва, што атрымліваюцца з бюджэтных крыніц (заработная плата; грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых тэрміновай службы, курсантаў ваенна-вучэбных устаноў і суворавацаў; дзяржаўныя стыпендыі навучэнскай моладзі) за кастрычнік гэтага года не індэксуюцца. Як растлумачыў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Пётр Грушнік, гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэнаў не перавысіў пяціпрацэнтны парог да красавіка 2008 года.

Заработная плата дзяржаўных служачых і прыраўнаваных да іх асобаў, грашовае забеспячэнне ваеннаслужачых і асобаў радавога і начальніцкага складу за кастрычнік гэтага года індэксуюцца на 5,4 працэнта, паколькі не перавышаны пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (ліпень 2008 года).

Дапамогі і стыпендыі беспрацоўным на перыяд прафесійнай падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі па накіраванні дзяржаўнай службы занятасці індэксуюцца на 5,3 працэнта, паколькі не перавышаны пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (красавік 2008 года).

Насельніцтву, якое атрымлівае даходы на тэрыторыі рэспублікі з іншых крыніц, кампенсацыя страт ад інфляцыі ажыццяўляецца на падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі).

Нагадаем, індэксацыя ажыццяўляецца па нарматыву, устаноўленаму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2006 года № 55 «Аб нарматыве індэксацыі грашовых даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі». Індэксуецца даход у межах 100 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражыткавага мінімуму, дзеючага на момант індэксацыі. Цяпер гэты нарматыў роўны Br223 тыс. 660. Частка даходу, якая перавышае гэту суму, індэксацыі не падлягае.

Паколькі індэкс спажывецкіх цэнаў за кастрычнік гэтага года не перавысіў пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (ліпень 2008 года), мінімальная заработная плата за кастрычнік гэтага года індэксуецца на 5,4 працэнта. Яе памер з улікам індэксацыйнай даплаты складае Br220 тыс. 80.

БЕЛТА.

Далоні на камяні

12 лістапада ў Магілёве адкрылі помнік «У памяць пра яўрэяў — ахвяраў нацызму».

Памятны знак — вялізны камень, на якім высечаны адбіткі далоняў.

— Гэта адбіткі душаў людзей, якія загінулі, — растлумачыў ідэю магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў. — Гэты камень мае ўнутраную энергетыку, бо далонь сімвалізуе жыццё чалавека і яго зварот да Бога.

Людзі, якія прыйшлі на адкрыццё помніка, імкнуліся дакрануцца да далоняў на камяні. Яны ўсклалі кветкі і каменьчыкі паводле старажытнай яўрэйскай традыцыі. Дзеці запалілі памінальныя свечкі.

Помнік месціцца ў цэнтры Магілёва, дзе ў гады вайны пачынаўся шлях у яўрэйскае гета на рацэ Дубравенка. Там было знішчана 2 тысячы яўрэяў.

З ініцыятывай усталяваць помнік у памяць бязвінных ахвяраў нацызму выступіла Магілёўская яўрэйская абшчына. Яе грашыма падтрымалі магіляўчане розных нацый і народнасцяў, узростаў і сацыяльных становішчаў. Кожны ахвяраваў колькі мог: нават зусім не заможныя пенсіянеры прыносілі па некалькі тысяч рублёў.

Адкрыццё помніка адбылося ў межах Дня культуры Ізраіля ў Магілёве. 12 лістапада таксама адкрыліся выставы ізраільскай літаратуры і жывапісу, прайшлі сустрэчы з прадстаўнікамі пасольства Ізраіля і кінапаказ.

Ілона ІВАНОВА.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Здарэнні

Дзік супраць «Пежо»

Увечары на аўтадарозе Орша — Шклоў ля вёскі Хімы «Пежо—306», якім кіраваў 22—гадовы вадзіцель, урэзаўся ў дзіка, які раптам выбег на праезную частку.

Машына з'ехала ў кювет і перакулілася. У выніку гэтага ДТЗ была траўмавана 20-гадовая пасажырка машыны — навучэнка медыцынскага каледжа.

Дзік загінуў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Абзац

■ У выніку выбуху самаробнага ацяпляльнага катла ў Гомелі разбурана кацельня. Кацёл працаваў на цвёрдым паліве, кацельня была прыбудаваная да памяшкання майстэрні індывідуальнага прадпрымальніка. У кацельні разбураны сцены і перакрыцці даху. Як мяркуюць спецыялісты МНС, выбух адбыўся з-за адсутнасці цыркуляцыі вады ў ацяпляльнай сістэме. Ахвяраў няма.

■ **У Мінску затрыманыя чацвёра грамадзян іншых дзяржаў і двое грамадзян Беларусі, якія мелі намер красці грошы з рахункаў англійскіх балельшчыкаў, якія прыехалі ў Мінск на футбольны матч «Беларусь — Англія». Было ўстаноўлена, што яны з дапамогай спецабсталявання капіравалі даныя з рахункаў грамадзян. Выехаўшы на тэрыторыю іншых дзяржаў, яны знялі з рахункаў 17 тыс. еўра і Br60 млн.**

■ Жыхар вёскі Астрошыцы Лагойскага раёна Аляксандр Зайцаў перадаў учора гісторыка-культурнаму комплексу «Лінія Сталіна» 76-міліметровую дывізіённую гармату Грабіна ўзору 1943 года. Гармата больш за 15 гадоў знаходзілася ў яго на падворку. Яе выявілі супрацоўнікі праваахоўных органаў падчас спецыяльных мерапрыемстваў «Арсенал» па выяўленні незарэгістраванай зброі. Гаспадар сядзібы добраахвотна перадаў гармату комплексу, таму вызвалены ад крымінальнай адказнасці за яе захоўванне. Зброю ён знайшоў паблізу вёскі Селішча Лагойскага раёна.

■ **У Пастаўскім раёне інжынер па тэхніцы бяспекі ўзяў трактар МТЗ сельскагаспадарчага прадпрыемства, дзе працаваў. Пакатаўшыся па вёсцы на працягу гадзіны-паўтары, 22-гадовы хлопец вярнуў яго на месца. Аднак гэтага часу хапіла старшыні гаспадаркі, каб заўважыць прапажу і паведаміць у праваахоўныя органы. Чалавеку пагражае ад 5 да 7 гадоў пазбаўлення волі.**

■ У каляндар расійскіх святаў прадстаўнікі сінадальнага аддзела па справах моладзі Рускай праваслаўнай царквы прапануюць дадаць Дзень цяжарных. Адзначаць новае свята прапануецца або ў дзень памяці Фёдараўскага абраза Прасвятой Багародзіцы, перад якой традыцыйна моляцца аб спрыяльным працяканні цяжарнасці і родаў, або ў дзень Пакрова Божай Маці. Гэта спрыяла б, на думку святароў, змяненню свядомасці людзей, іх стаўлення да абортаў, родаў і цяжарнасці.

■ **Даследчыкі са Школы медыцыны Мэрыленда (ЗША) высветлілі, што эмоцыі, якія чалавек адчувае пры гучанні любімых мелодый, станоўча ўплываюць на працу крывяносных сасудаў — сасуды пашыраюцца пры гэтым амаль на 26 працэнтаў. У той жа час трывожная музыка прымушае сасуды звужацца на 6 працэнтаў. На думку навукоўцаў, гэта можа стаць метадам прэвентыўнай стратэгіі для прафілактыкі сардэчных захворванняў у паўсядзённым жыцці.**

Поўны абзац

■ Касірка берлінскага супермаркета выратавалася ад узброеных рабаўнікоў, «абстраляўшы» іх сырам, што трапіўся пад руку. Трое мужчын уварваліся ў магазін і, пагражаючы зброяй, запатрабавалі аддаць ім дзённую выручку. Аднак 50-гадовая касірка Марціна Боль адчайна супраціўлялася, закідаўшы рабаўнікоў кавалкамі сыру. Яна трапіла аднаму з іх сырам у твар, і злачынцу стала не да рабавання — сыр аказаўся гатунку гарганзола, што мае вельмі смярдзючы пах. Сырная атака аказалася супастаўляльнай з дозай слёзатачывага газу, і рабаўнікі палічылі за лепшае збегчы.

■ **Жыхарка Бразіліі загінула па дарозе на пахаванне мужа. Жалобная працэсія накіроўвалася на могілкі. 67-гадовую жанчыну забіла труной з целам мужа-нябожчыка. Гэта здарылася ў выніку аварыі, у якую трапіў катафалк. Жанчыну ўдарыла труной па патыліцы,траўма аказалася смяротнай. Вадзіцель катафалка атрымаў некалькі драпін. Муж загінулай бразільянкі памёр ад сардэчнага прыступу падчас танцаў на вечарынцы.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Спорт-тайм

«ДЫНАМА» НАБЛІЗІЛАСЯ ДА «СЕРАБРА»

9 лістапада ў чэмпіянаце Беларусі па футболе адбыліся матчы перадапошняга, 29-га тура.

Чэмпіёны краіны футбалісты барысаўскага БАТЭ гулялі ў гасцях у прэтэндэнта на сярэбраныя медалі сталічнага «Дынама». Мінчане выйгралі з лікам 2:1. Яшчэ адзін прэтэндэнт на другое месца сталічны МТЗ-РІПА ў сябе дома без асаблівых праблем узяў верх над землякамі з «Лакаматыва», які страцілі шанцы на захаванне месца ў вышэйшай лізе, з лікам 3:1. Цікава, што на гэты матч гульцы «Лакаматыва» дабіраліся на метро.

Прынцыповы паядынак «Віцебска» з гасцямі з салігорскага «Шахцёра» скончыўся ўпэўненай перамогай гаспадароў — 3:0. Дзякуючы гэтаму поспеху, падапечныя Аляксандра Хацкевіча пацяснілі гарнякоў з чацвёртага месца турнірнай табліцы.

Футбалісты магілёўскага «Савіта», якія ў гэтым сезоне дэбютавалі ў кампаніі маценейшых, прайгралі ў гасцях брэсцкім дынамаўцам 1:4 і ў наступным сезоне зноў выступяць у першай лізе. Вынікі астатніх сустрэч: «Нёман» (Гродна) — «Гомель» — 1:0, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Смаргонь» — 1:3, «Дарыда» (Мінскі раён) — «Нафтан» (Наваполацк) — 0:3, «Днепр» (Магілёў) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 0:1.

Перад заключным турам, які адбудзецца 16 лістапада, у БАТЭ 63 ачкі, мінскае «Дынама» мае 59 балаў, а сталічны МТЗ-РІПА адстае ад дынамаўцаў на 2 ачкі.

Незразумелым застаецца толькі адно пытанне, якая з дзвюх мінскіх камандаў стане ўладальніцай «серабра», а якая «бронзы». У апошнім матчы «Дынама» згуляе ў гасцях у «Савіта», а канкурэнты таксама на выездзе правядуць матч супраць «Гомеля».

ЦЫПЛАКОВА ЗАПРАШАЕ «АВАНГАРД»

Адзін з настаўнікаў зборнай Беларусі па хакеі Уладзімір Цыплакоў запрошаны ў трэнерскі штаб омскага «Авангарда», які выступае ў КХЛ.

Да сярэдзіны кастрычніка Цыплакоў быў асістэнтам у амерыканскага рулявога мінскага «Дынама» Джыма Х'юза, аднак пакінуў сталічны клуб пасля адстаўкі замежнага спецыяліста.

У «Авангардзе» беларускаму спецыялісту трэба будзе працаваць з галоўным трэнерам — канадцам Уэйнам Флэмінгам, які мінулым летам ледзь не стаў кіраваць мінскім «Дынама», аднак у апошні момант бакі не дамовіліся.

САМСОНАЎ ПАСПРАЧАЕЦЦА ЗА СУПЕРКУБАК

Лідар беларускага настольнага тэніса Уладзімір Самсонаў, які ўваходзіць у лік васьмі лепшых майстроў малой ракеткі Старога Свету, выступіць у другім розыгрышы Суперкубка Еўропы, які праходзіць у падмаскоўным горадзе Віднае 11—13 лістапада.

Агульны прызавы фонд турніру складае 120 тысяч долараў. Год таму, калі першы падобны турнір прымала расійская Казань, у вырашальным паядынку Уладзімір Самсонаў саступіў Ціму Болу.

«РЭАЛ» ЗАЦІКАВІЎСЯ АРШАВІНЫМ

Кіраўніцтва мадрыдскага «Рэала» можа паспрабаваць набыць паўабаронцу піцерскага «Зеніта» Андрэя Аршавіна.

Зараз «вяршковыя» адчуваюць праблемы адразу па некалькіх пазіцыях у паўабароне, і галоўны трэнер «Рэала» Бернд Шустэр прызнаўся, што зверне ўвагу на футбалістаў, якія будуць даступныя для пераходу зімой. У сваю чаргу Аршавін заявіў, што ў наступным сезоне не мае намеру выступаць за піцерскі клуб.

Клуб таксама не збіраецца трымаць футбаліста. У студзені «Зеніт» будзе весці перамовы аб продажы Аршавіна толькі напрамую з зацікаўленымі клубамі.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства гаража № 60 (пл. 25 кв.м) с подвалом (пл. 10 кв.м) в ГК «Днепровец» в г. Борисове. Начальная цена снижена на 10 % — 8 321 940 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2008 г. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже ЛОТа № 1 — цеха лесопильного (общ. пл. 548,7 кв.м) по адресу: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Начальная цена снижена на 10 % и составляет — 79 002 900 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2008 г. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327.
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания прирельсового склада (общ. пл. 424,3 кв.м), расположенного: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Нач. цена снижена на 20 % — 82 567 100 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2007 г. Аукцион состоится **25.11.2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327
Сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 2 декабря 2008 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов без изменения целевого назначения.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток в установленном размере на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж). Граждане, желающие участвовать в торгах по нескольким лотам, вносят задаток **от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью;**

представить следующие документы:

1) копию платежного поручения, заверенную банком, о внесении задатка;

2) паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность;

3) заявление на участие в аукционе установленной формы;

4) соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Задаток учитывается в стоимость выигранного на аукционе земельного участка.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона. Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона и документацией, необходимой для его проведения.

Общая сумма расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, составляет 3056481 рубль.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **28.11.2008 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **2.12.2008 года** с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	ул. Слепокурова, 12	0.1075 га	740100000001004554	5 579 000	509 000
2	ул. Изумрудная, 47	0.1101 га	740100000007004320	3 931 000	354 000

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

РАБОТА ПЛЮС «ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ»

Прамая лінія

На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць загадчык юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ШЭЛКОВІЧ і намеснік загадчыка юркансультацыі ФПБ Васіль Мікалаевіч КОРСУК.

(Працяг. Пачатак у нумары за 12 лістапада.)

☎ ***— Дачка жыве ў Мінску менш за 5 гадоў, таму ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў яе не ставяць. Разам з тым мы хочам купіць у сталіцы кватэру — з выкарыстаннем камерцыйнага крэдыту. Скажыце, калі ласка, ці можна пагасіць частку гэтага крэдыту чэкамі «Жыллё»?***

Ірына Каранец, *г. Слонім*

— Не. Выкарыстаць на пагашэнне крэдыту перарэгістраваныя чэкі «Жыллё» можна было б толькі ў выпадку, калі б дачка стаяла ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

☎ ***— У красавіку мне споўніцца 54 гады. Ці змагу я тады выйсці на пенсію з улікам таго, што ў свой час восем з паловай гадоў даглядала дома дачку-інваліда — пакуль ёй не споўнілася 18 гадоў? І ў выпадку, калі я на пенсію ўсё ж выйду, то ці змагу я дапрацаваць на цяперашнім месцы, прынамсі, да свайго 55-годдзя? Або тут усё будзе залежыць ад рашэння наймальніка?***

Таццяна Яўгенаўна

— Увогуле, Таццяна Яўгенаўна, варта заўважыць, што маці, якая выхоўвала дзіця-інваліда сама, прынамсі, 8 гадоў да яго паўнагоддзя, можа выйсці на пенсію нават у 50 гадоў. А што да пытання, зможаце вы працягнуць пасля выхаду на пенсію работу або не, то ў любым выпадку вы павінны дапрацаваць да заканчэння кантракта. А надалей усё будзе залежаць ад наймальніка. Пры гэтым трэба падкрэсліць: патрабавання не працягваць кантракты з пенсіянерамі ў заканадаўстве няма.

☎ ***— Падчас падпісання кантракта мяне пазнаёмілі са службовай інструкцыяй. Ці можа наймальнік ужо праз паўгода гэтую інструкцыю змяніць і вызначыць дадатковыя абавязкі?***

Аляксандр Пятровіч, *г. Мінск*

— Пры заключэнні працоўнага дагавора павінны вызначацца службовыя абавязкі, прычым патрабаваць выканання звыш такіх абавязкаў наймальнік не мае права. Разам з тым, пашырыць кола службовых абавязкаў наймальнік можа. Аднак гэта будзе лічыцца змяненнем істотных умоў працы. Таму наймальнік будзе абавязаны патлумачыць сваё рашэнне арганізацыйнымі, вытворчымі або эканамічнымі прычынамі і папярэдзіць аб мяркуемых новаўвядзеннях работніка не пазней чым за месяц. А надалей работнік павінен зрабіць выбар. Або пагадзіцца з пашырэннем сваіх абавязкаў (і ў тым ліку з даплатай), або не пагадзіцца. Праўда, у апошнім выпадку работнік можа быць звольнены паводле артыкула 35 Працоўнага кодэкса з выплатай двухтыднёвай выхаднай дапамогі.

☎ ***— Турбуюць работнікі кацельні з горада Сянно. Нам зменшылі на 3 дні водпуск і патлумачылі — нібыта мы пазбавіліся гэтых дзён у сувязі з атэстацыяй працоўных месцаў. Аднак на справе атэстацыя не праводзілася, да нас ніхто не прыязджаў і ніякія замеры не рабіў. Парайце, што рабіць у такой сітуацыі?***

— Калі раней працоўныя месцы прызнаваліся шкоднымі, а цяпер фактычна без правядзення атэстацыі — не, то тут сапраўды ўзнікаюць пытанні. Таму мы раім вам звярнуцца ва ўпраўленне дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Віцебскага аблвыканкама — якасць правядзення атэстацыі кантралюе менавіта гэта структура.

☎ ***— Мой муж адпрацаваў 20 гадоў трактарыстам у калгасе, затым звольніўся, аднак праз паўгода вярнуўся ў тую ж гаспадарку — праўда, ужо слесарам. Ці павінны яму рабіцца даплаты за стаж? І ад чаго залежаць такія даплаты — ад стажу па спецыяльнасці або ад стажу работы ў арганізацыі?***

Соф'я Васільеўна МІЛІШКЕВІЧ, *Клецкі раён*

— Працоўны кодэкс насамрэч прадугледжвае магчымасць устанаўлення даплаты за стаж. Аднак тут агульныя падыходы існуюць толькі для бюджэтнай сферы, астатнія арганізацыі рэгулююць гэта пытанне самастойна. Інакш кажучы, у наймальніка павінна быць пэўнае палажэнне (як правіла, гэта дадатак да калектыўнага дагавора), якое і вызначае, за які стаж, як і колькі трэба даплачваць. Таму адказ на пытанне залежыць выключна ад таго, што запісана ў гэтым палажэнні.

☎ ***— Як павінна налічвацца даплата за стаж у сельгасарганізацыі работніку-здзельшчыку — у залежнасці ад тарыфнай стаўкі ці ад зарплаты?***

Па-другое. Куды, апроч прафкама арганізацыі і суда, можна звярнуцца ў выпадку парушэння калектыўнага дагавора?

І па-трэцяе. Падчас масавых сельгасработ у арганізацыі не наладжана спаборніцтва. Як змяніць сітуацыю?

Леанід, *Лагойскі раён*

— Па-першае. Зноў-такі гэта пытанне вырашаецца на лакальным узроўні — у канкрэтнай арганізацыі. Можна толькі заўважыць, што, як правіла, даплаты «прывязваюцца» да тарыфнай стаўкі.

Па-другое. Калі вы не хочаце звяртацца ў суд, то з пытаннем аб парушэнні калдагавора можна звярнуцца ў дзяржаўную інспекцыю працы або ў прававую інспекцыю прафсаюзаў. І, у прыватнасці, у прававую інспекцыю галіновага прафсаюза.

І па-трэцяе. Прымусіць наймальніка наладзіць такое спаборніцтва нельга, ды і, уласна кажучы, гэта не яго справа. Пытанне арганізацыі спаборніцтва лепш за ўсё абмеркаваць са старшынёй свайго прафкама. Або, як варыянт, можна зноў-такі звярнуцца па дапамогу ў прафсаюз работнікаў аграпрамысловага комплексу. Да слова, структурныя падраздзяленні работнікаў АПК ёсць у кожным раёне.

☎ ***— Да льготнай пенсіі за шкодныя ўмовы ў 50 гадоў мне засталося 6 месяцаў. Ці абавязаны наймальнік працягнуць на гэты час кантракт?***

Сяргей Антонавіч ШАКЕЛЬ, *г. Наваполацк*

— Гарантыі па працягу кантракта датычацца толькі работнікаў, якім засталося няшмат да дасягнення агульнага пенсійнага ўзросту, — мужчын ва ўзросце больш за 58 і жанчын ва ўзросце больш за 53 гады. Таму, паводле заканадаўства, у вас такіх гарантый няма. Аднак, магчыма, яны вызначаны на ўзроўні калектыўнага дагавора вашага прадпрыемства. Скажам, калі у калдагаворы ёсць запіс аб немагчымасці звальнення работнікаў перадпенсійнага ўзросту без указання канкрэтных лічбаў, вы павінны застацца на працы.

☎ ***— Ці абавязаны зараз наймальнік адпускаць на сесію студэнта-завочніка, які не мае накіравання з месца працы, але хоча павысіць сваю кваліфікацыю?***

Сяргей Аляксандравіч, *г. Мінск*

— Калі наймальнік на навучанне вас не накіроўваў і не заключаў дамовы на падрыхтоўку спецыяліста, то прадастаўляць водпуск «за свой кошт» на сесію вам не абавязаныя. Прадастаўленне такога водпуску магчыма толькі паводле дамоўленасці. Праўда, зноў-такі трэба падкрэсліць: водпуск «на сесію» стане абавязковым, калі аб ім зроблены адпаведны запіс у калектыўным або працоўным дагаворы і пры гэтым работнік атрымлівае першую вышэйшую адукацыю.

Сяргей ГРЫБ.

(Заканчэнне будзе.)

ОАО «Белтрансгаз» (арендодатель) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДЯТ АУКЦИОН

на право заключения договоров аренды с 01.02.2009 г. нежилых помещений (сроком на 3 года), расположенных по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9:

№ лота	Тип нежилого помещения, сооружения	Общая площадь (м²)	Ставка арендной платы за 1 м²	Начальная цена права аренды (бел. руб.)
1	складское помещение	236,34	10 евро	6 465 861
2	складское помещение	102,96	10 евро	2 816 811
3	складское помещение	70,98	9 евро	1 747 703
4	складское помещение	64,48	10 евро	1 764 064
5	складское помещение	47,06	10 евро	1 287 482

Право на заключение договоров аренды продается с условием использования арендуемых площадей по назначению (административные помещения под офис, складские помещения для складирования, хранения продовольственных, промышленных товаров). Оплата стоимости права аренды производится в течение 10 дней после подписания протокола о результатах аукциона на р/с арендодателя. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор аренды подписывается сторонами в течение 5 календарных дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9, актовый зал Управления «Торгсервис». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ОАО «Белтрансгаз» (арендодатель) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона)

ПРОВОДЯТ АУКЦИОН

на право заключения договоров аренды с 02.01.2009 г. нежилых помещений (сроком на 3 года), расположенных по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9:

№ лота	Тип нежилого помещения, сооружения	Общая площадь (м²)	Ставка арендной платы за 1 м²	Начальная цена права аренды (бел. руб.)
1	складское помещение	290,1	6 евро	4 761 986
2	складское помещение	209,3	10 евро	5 726 093
3	складское помещение	177,84	10 евро	4 865 401
4	складское помещение	118,3	9 евро	2 912 839
5	складское помещение	93,21	10 евро	2 550 068
6	складское помещение	42,6	9 евро	1 048 918
7	автостоянка	1400	2 евро	7 660 324
8	административное помещение	33,97	6 евро	557 617
9	административное помещение	25,6	6 евро	420 224
10	административное помещение	22,62	6 евро	371 307
11	административное помещение	17,7	6 евро	290 546
12	административное помещение	11,55	6 евро	189 594

Помещения расположены в 3 км от МКАД, (2 остановки от ст. метро «Могилевская»), охраняемая территория, автостоянка, удобный подъезд. Право на заключение договоров аренды продается с условием использования арендуемых площадей по назначению (административные помещения под офис, складские помещения для складирования, хранения продовольственных, промышленных товаров). Оплата стоимости права аренды производится в течение 10 дней после подписания протокола о результатах аукциона на р/с арендодателя. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор аренды подписывается сторонами в течение 5 календарных дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9, актовый зал Управления «Торгсервис». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Простыя рэчы

ГАЛЬШТУК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У акцябраты нас прымалі ў першым класе ў 1962-м у танцавальнай зале гарнізоннага Дома афіцэраў. У школе проста не было адпаведнага памяшкання. Урачыстасць неяк не помніцца. Затое помніцца, што ў зале была слізкая падлога, як цяпер разумею, нацёртая масцікай. І жэўжыкі кінуліся катацца па ёй, як па лёдзе. Нас неяк утаймавалі, прышпілілі да грудзей зорачкі з партрэтам маленькага Уладзіміра Ульянава. А вось у піянеры прымалі ўжо больш урачыста, на плошчы райцэнтра, якая насіла імя Леніна. Сабралі ўсіх не паводле жадання, а па тагачаснай завядзёнцы і разнарадцы з усіх школ (а тых школ жа было — дзве сярэднія і дзве васьмігадовыя). Нешта гаварылася, гучала музыка. А потым на грудзі ўсім нам павязалі чырвоныя гальштукі — папярэдне купленыя нашымі маці ў адпаведнасці ўсё з той жа завядзёнкай. Вось тут ужо з сябрамі ішлі па гарадку з горда ўзнятымі галовамі, ва ўрачыстым настроі, усіх сустрэчных віталі вывучаным піянерскім прывітаннем, ускідваючы руку не па-вайсковаму да скроні, а да лба.

Але бацька дома ахаладзіў маю гарачнасць, патузаўшы за два канцы гальштука:

— Ну што, хусцінку завяжаў?

Ён быў чалавек апалітычны, але да тагачаснай ідэалогіі ставіўся з сялянскай звычкай недаверліва. Прычым за шэсць гадоў вайны і салдацкай пасляваеннай службы шмат пабачыў і многае зразумеў. Дарэчы, не без скепсісу да піянерская гальштука хутка сталі ставіцца і мы. І ўжо ў пятым — шостым класах клопатам піянерважатай, настаўнікаў было ўпікаць нас за незавязаны гальштук. А калі і завязвалі яго ў школе, то, выходзячы з яе, здымалі, хавалі ў свае партфелі. А ў сёмым класе прыйшла камсамольская пара са сваімі атрыбутамі, але ўжо без гальштукаў. Сёння і першакласнік ідзе ў школу пад гальштукам, але ж не чырвоным, а якім-небудзь фацэтным, модным.

Мы гэтага не рабілі, ды і не маглі рабіць з проста матэрыяльнага становішча нашых бацькоў. І гальштук каштаваў нямала, і касцюмчык да яго павінен быць адпаведным. А больш з-за таго, што не мелі такой моды.

Калі я ўжо быў у старэйшых класах, бацька, які служыў сяржантам звыштэрміновай службы ў Польшчы, прывёз некалькі нябачаных у нашых крамах гальштукаў. Ды і на школьныя вечары я іх не адзяваў. Упершыню маці папрасіла надзець адзін з іх у час выпускнога вечара ў школе. А перад гэтым мы з сябрам, ужо вольныя ад школьнага начальства, пастрыгліся амаль «пад нуль». Такая была тады мода, (зараз яна, відаць, вярнулася). І атрымаўся здымак — сярод аднакласнікаў стаяць два зэкаўскага выгляду хлапцы з круглымі тварамі, шыі сарочак у якіх сцягваюць гальштукі. І гэта летам.

А ў зімовы час маці нярэдка ўгаворвала:

— Адзень ты гальштук, цяплей будзе.

Яно, безумоўна, так. Але ёсць шалік ці світар пад горла.

Увогуле, стасункаў з гальштукам у мяне не атрымалася. Надзяваў яго некалькі разоў. Калі прымалі ў партыю, вымушаны быў пазычыць на час у свайго калегі па ўступленні. Бо ні ў кабінет, дзе засядала бюро райкама, ні ў фатаграфію, дзе здымалі нас на партыйныя білеты, без гальштука не пускалі.

Яшчэ адзін вымушаны выпадак адзявання гальштука — вяселле. Тут маладому таксама не дазвалялася быць без гальштука. Яны за прайшоўшы час змяніліся. Ранейшыя, на гумцы, адышлі з моды. Трэба было самому завязваць гальштук — у той час вузлом. Як найтаўсцей. І спецыялістаў па завязванні гальштукаў на нашай вуліцы не было. Давялося ісці ў краму да знаёмай прадаўшчыцы, каб зрабіла гэту складаную і незразумелую справу. Я яго патрымаў на шыі толькі ў ЗАГСе ды пры абавязковым фатаграфаванні. Але на другі дзень вяселля быў ужо без гальштука. Не, былі ў нашай маладосці такія сябры, што насілі гальштукі. Толькі ставіліся да іх не з вялікай павагай, называлі селядцамі. Ды ў няўмелага носьбіта гэтага аксесуара часам так і бывала, што ў застоллі ў талерку перад ім трапляў гальштук. А каторы падвыпіты кавалер перад уваходам на танцпляцоўку мог і чаравікі адваротным ходам вярнуць у модзе былі даўгія і шырокія гальштукі, аж да пояса, а то і ніжэй.

Заліць за гальштук — тлумачэнняў, відаць, гэтаму ўстойліваму некалі выразу не патрэбна.

Хоць, прызнаюся, што чалавек у гальштуку, які яму пасуе, мне вельмі прыемны. Паходзіць слова з нямецкай — Halstuch. А немцы народ акуратны і дакладны ў паводзінах. Дарэчы, ёсць птушка, якая бывае ў Беларусі толькі ў час пералётаў, і называецца яна — гальштучнік. Вось чаму: апярэнне ў птушкі зверху пясчана-дымчатае, грудзі і брушка белыя, а ўпоперак валля чорная палоска — «гальштук».

Толькі ў гады кіравання КПСС сумнавата было глядзець на партыйныя канферэнцыі і сходы. Сядзяць няўсмешлівыя мужчыны ў цёмных касцюмах, з цёмнымі гальштукамі. Суровая зала мала расквечана жаночымі тварамі, ды і жанчыны ў строгіх касцюмах. Сёння становішча крыху мяняецца. Ды і чыноўнікі навучыліся падбіраць сабе добра пашытыя касцюмы, разнастайваць колеры гальштукаў. А на ўзроўні кіраўнікоў урадаў нават тэрмін новы ўведзены: сустрэча без гальштукаў. Не ведаю, ці дапамагае гэта пры міжнародных перамовах. Але без гальштукаў кіраўнікі і тварамі мякчэюць, і ўсміхаюцца часцей.

І ўсё-такі, як разумею, гальштук — нейкая адзнака годнасці чалавека. Каб яго зняважыць — маглі і адрэзаць. А часам гальштук выкарыстоўваўся зусім не па прызначэнні. Нездарма ж калі чалавека арыштоўваюць і змяшчаюць у камеру, у яго забіраюць рэмень ад штаноў, шнуркі, а таксама гальштук.

Помніцца польскі фільм «Пабанку». Камедыйная і авантурная стужка. Там герой, наколькі помніцца, па прозвішчы Квінта трапляе ў пастку. Яму, каб выбрацца, патрэбна ўзарваць каністру з бензінам. Але ж патрэбны шнур для запальвання. І ён здымае з сябе гальштук.

Наколькі разумею, гальштук ці яго папярэднікі з'явіліся ў чалавека, каб прыкрыць шыю. Піраты і проста матросы мінулых стагоддзяў малююцца менавіта з шыйнымі хусткамі. У марах пад спякотным сонцам ён крыху дапамагаў і ад поту. Нямала стагоддзяў насілі шыйныя гальштукі афіцэры розных армій. Каўняры мундзіраў былі высокімі, цвёрдымі, нават шытымі металам. І гальштук ці шыйная хустка тут — перасцярога. Між іншым, некалі была мода, крыху захоўваецца яна і цяпер: як выступае чалавек мастацтва ці проста эстэт — ён у сарочцы, а пад ёй на шыі якая-небудзь стракатая хустка. У часы СССР для творчай інтэлігенцыі гэта быў нібы знак адрознення — «я свой», а магчыма, і пратэст супраць тагачаснай абавязковай завядзёнкі на строгі касцюм і гальштук. Моду гэту перахапілі і проста людзі, якія хацелі выдзеліцца калі не розумам, то адзеннем.

Доўга праіснавала ў адзенні і жабо (ад французскага jabot). Гэта карункавыя альбо кісейныя брыжы вакол каўняра і на грудзях у мужчынскай сарочцы. Паслухайце, відаць трэба растлумачыць і старое беларускае слова брыж — гэта вузкая палоска тканіны, сабраная ў зборачкі, якой аздабляюць адзенне ці што іншае. У Якуба Коласа:

Тут ёсць абрус яе работы
З брыжамі белымі, як снег.

А бабачка — гальштук у выглядзе банта. Некалі маё пакаленне вучыла па карыкатурах, палітычных кінафільмах — што бабачка, нароўні з цыліндрам, гэта адна з прыкмет буржуазіі і таго, заходняга жыцця. Наконт цыліндраў — справа мінулая. А вось бабачкі сёння ў вялікай модзе.

Беларускаму нацыянальнаму адзенню гальштук не быў уласцівы. Ды і падумайце, навошта нейкім гальштукам прыкрываць прыгожую вышыўку на кашулі? Але ў XVIII стагоддзі ў вышэйшыя слаі беларускага грамадства, а потым і ў дробнае дваранства, шляхту пачынаюць пранікаць павевы заходняй моды. У досыць падрабязным даведніку аб беларускім адзенні ад старажытных часоў з малюнкамі я знайшоў першы гальштук у дваранiна сярэдзіны XIX стагоддзя. Але нiжэйшыя слаі ім не карысталіся да канца XIX стагоддзя. А вось у XX гальштук пачаў распаўсюджвацца досыць шырока. Адбіваўся рост гарадоў, адток у іх сялянства, якія з горада прывозілі не толькі цукеркі ды пернікі, але новыя павевы моды.

Заходзіш у вясковую хату — і на сцяне пад шклом своеасаблівы калаж са старых фотаздымкаў. Якраз ад мінулага стагоддзя. І ўжо нярэдка можна ўбачыць вусатага дзядзьку, па постаці яўна паплюшчанага цяжкай сялянскай справай. Але ў яго пад прасценькім пінжаком, на прасценькай кашулі — гальштук. Для нашых мясцін гэта больш бачна яшчэ і таму, што да 1939 года мы былі ў складзе Польшчы. Шмат было прыслана сюды з карэнных польскіх земляў чыноўнікаў, асаднікаў, настаўнікаў. Яны неслі свае ідэі, часам варожыя беларусам, але разам з тым і сваю культуру ў адзенні, выкшталцонасць.

Першы здымак у зборы твораў Янкі Купалы адносіцца да 1904 года. На паэце прыгожы гарнітур і гальштук-бабачка. І ва ўсіх сямі тамах на шматлікіх здымках — ён пад гальштукам, выглядае заўжды менавіта, скарыстаем слова суседзяў — выкшталцона. Якуб Колас таксама не цураўся гальштука, але выглядаў менш прэзентабельна, прыземлена.

Здымак пісьменнікаў-маладнякоўцаў ад 1924 года. Вялікая група цяпер вядомых маладых пісьменнікаў і толькі ў аднаго, Міхася Чарота, пад пінжаком-фрэнчам белая сарочка і гальштук. Стаіць сярод іх і малады Кузьма Чорны ў цёмнай кашулі, больш падобнай на гімнасцёрку. Але ўжо на здымку 1927 года ён у прыгожым гальштуку. І надалей не расстаецца з ім.

Умеў насіць гальштук Максім Танк: адбілася, мусіць, віленскае жыццё. Вядома ж, ёсць здымкі, дзе ён без гальштука вымушана: здымак з паліцэйскага архіва — у турме гальштукі, як пісаў я вышэй, не дазваляюцца, а таксама калі ён у вайсковай форме падчас вайны. Здымаў гальштук і падчас адпачынкаў на Нарачы. Але строгасці ў адзенні прытрымліваўся.

Уладзімір Караткевіч з'яўляецца на фотаздымках пад гальштукам студэнтам трэцяга курса Кіеўскага ўніверсітэта. Таксама ўмеў яго насіць. Але, мяркуючы па здымках са збору яго твораў, у час шматлікіх вандровак па Беларусі ахвотна адмаўляўся ад яго. Ды і не прысядзеш вогнішча ў гальштуку, тут больш пасуе ватоўка.

Ну, вось такі мой погляд на гальштук.

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

Суседзі

Імёны Купалы і Коласа нададзены вуліцам Гайнаўкі

У Гайнаўцы адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнай дошкі на будынку музея беларускай культуры з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і надання іх імёнаў дзвюм вуліцам горада.

Такое рашэнне было прынята гарадскім Саветам па прапанове пасла Беларусі ў Польшчы. Выраб і ўстаноўка памятнай дошкі прафінансаваныя Культурным цэнтрам Беларусі ў Польшчы (КЦБ) сумесна з беларускім прадпрыемствам «Белпі» (г. Смалявічы).

Дарэчы, КЦБ цяпер будзе размяшчацца ў новым памяшканні плошчай каля 200 квадратных метраў у цэнтры Беластока. На ўрачыстай цырымоніі з гэтай нагоды пасол Павел Латушка ад імя КЦБ і Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь уручыў каштоўныя падарункі (тэлевізары, камп'ютары, DVD) Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству ў Польшчы, ліцэям з дадатковым вывучэннем беларускай мовы ў Гайнаўцы і Бельску-Падляскім, музею беларускай культуры ў Гайнаўцы і іншым установам, якія плённа дзейнічаюць на ніве захавання беларускай мовы, культуры, нацыянальных традыцый.

Лепшая страва — «Дзік у цесце»

Дванаццаць дэлегацый, якія прадстаўлялі лепшыя рэстараны Беларусі і Польшчы, удзельнічалі ў першым фестывалі беларускай і польскай кухні.

Ён адбыўся ў Нацыянальным парку Белавежа (польская частка Белавежскай пушчы) пад патранатам грамадскага аб'яднання лепшых шэф-кухараў Польшчы. Арганізатарамі фестывалю сталі гасцініца «Жубруўка» і эксперт па кулінарных пытаннях Тэафілас Вафідзіс пры садзейнічанні беларускіх дыпламатаў у Польшчы.

Нашу краіну прадстаўлялі рэстараны з Мінска, Гродна і Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». У рамках фестывалю адбыўся конкурс на лепшую страву нацыянальнай кухні. Рашэннем журы, у склад якога ўвайшлі спецыялісты ў галіне кулінарыі з Грэцыі, Швейцарыі і Польшчы, першае месца заняла каманда рэстарана «Мінск» за страву «Дзік у цесце».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81

№ 34 (284)

Уцяпляем карані

Калі ў лістападзе снегу няма, а мароз часам падкрадваецца і даволі сур'ёзны, накрыйце глебу ў садзе перагноем, торфам, яловымі галінкамі, пілавіннем, сухімі лістамі.

Бывае такое, што пасля першых замаразкаў, асабліва пасля дажджлівай восені, з зямлі выпіраюць цыбуліны, суніцы, чаранкі. Вільгаць, якая знаходзіцца ў глебе, пры вымярзанні ператвараецца ў лёд, які расшыраецца і выштурхоўвае расліны, якія дрэнна ўкараніліся. Калі вы замульчыравалі глебу пасля пасадкі, то вас абміне гэтая непрыемнасць. Але на ўсякі выпадак трэба мець дадатковы запас рыхлага субстрату, каб прыкрыць карані, якія вылезлі з зямлі пасля замаразку. Калі пасадкі зроблены на ўзгорачках (напрыклад, суніцы, цыбуля), акрамя мульчы, абавязкова ўкрыйце іх яловымі лапкамі.

Клопаты пра маладняк

Як паклапаціцца, каб куплены саджанец апраўдаў вашы надзеі, дапаможа разабрацца **вядучы спецыяліст НДІ пладаводства Надзея КАПІЧНІКАВА**.

Пасадзіўшы маладое дрэва, садавод, стараючыся стварыць яму найбольш камфортныя ўмовы, рэдка звяртаецца да абрэзкі і фарміравання кроны. Між тым пры выкопванні саджанца ў гадавальніку пашкоджваецца каля 80—90 працэнтаў каранёў, прычым у большай ступені найбольш прадуктыўных, тых, якія ўсмоктваюць ваду, пажыўныя рэчывы. Вось і атрымліваецца, што дрэва ў 2-3 разы менш спажывае патрэбнай яму колькасці, напрыклад, вады, чым выпараецца праз кару і пупышкі. Яшчэ бывае, што і лісты не абрываюцца пры пасадцы — такія саджанцы прыжываюцца вельмі дрэнна. Вясной на галінках неабрэзаных дрэў з-за недахопу сілкавання развіваюцца слабыя парасткі з дробнымі лістамі, а расліна хварэе.

Пры першай абрэзцы паламаныя галінкі зразаюць, а астатнія ўкарочваюць. Паклапаціцеся, каб цэнтральны правадник займаў дамінуючае становішча і не меў канкурэнта. Калі ў гатункаў дрэва паніклая форма кроны, праваднік павінен быць вышэйшы на 10—15 см за астатнія галінкі, з пірамідальнай кронай — на 20—25. Калі крона пірамідальная, то бакавыя галінкі абразаюць на знешнюю пупышку, не даючы дрэву загушчацца. Пры паніклай кроне зрэз робяць над пупышкай, якая звернута ўнутр. Укарочванне цэнтральнага правадніка і галінак абавязковае для гатункаў яблыні, у якой слаба ўтвараюцца парасткі. Такія дзеянні часткова ліквідуюць гэты недахоп і прадухіляць магчымыя разломы дрэў, а таксама паскораць уступленне ў пару плоданашэння. Месцы зрэзаў трэба апрацаваць эпінам. Затым іх замазваюць варам або алейнай фарбай.

Калі вы набылі саджанец увосень, пажадана намеціць месцы будучых зрэзаў. Паламаныя галінкі выражце адразу, а вясной абрэжце саджанцы як намецілі.

Караняплоды на захоўванні

Вырашчаныя з такой любоўю морква, буракі, рэпа, бручка, пастэрнак, сельдэрэй — усё гэта акуратна прыбрана і складзена на захоўванне. Не палянуйцеся тады ж праверыць, як адчуваюць сябе караняплоды.

Можа, спачатку ўсё ў парадку, але з цягам часу на караняплодах там-сям з'яўляецца налёт. Часцей за ўсё яны пакутуюць ад белай гнілі, прычым захворваюць яны не на градках. Асабліва пакутуе ад гэтай хваробы морква. Прычына — павышаная вільготнасць у час вырошчвання і празмерная вільготнасць у сховішчы. Вопыт падказвае, што падсушаная перад закладкай агародніна менш пакутуе ад гэтага захворвання. Магчыма, што на градкі гэту хваробу вы занеслі з гноем ці кампостам.

Характэрна, што дробная морква менш устойлівая да белай гнілі, чым вялікая таго ж гатунку. На лёжкасць караняплодаў дабратворна ўплывае ўнясенне ў глебу пры іх вырошчванні фосфарна-калійных угнаенняў. Караняплоды захоўваюцца пры тэмпературы каля нуля градусаў, вільготнасці паветра не больш як 95 працэнтаў. Прыметы захворвання белай гніллю: караняплоды мякчэюць не мяняючы афарбоўкі, потым пакрываюцца белай плесняй. Калі вы выявілі ачаг захворвання, то караняплоды перабярыце і выкіньце тыя, якія захварэлі.

Трапічная расліна каланхоэ

«Суседка дала маленькія раслінкі, сказала, што гэта каланхоэ, што расліна вырасце і што яна лечыць ад многіх хваробаў. Раскажыце, чым яна карысная».

Марыя Іванаўна з Мінска

Каланхоэ адносіцца да роду трапічных сакавітых раслін з сям'і таўсцянковых. Яе радзіма — цёплыя тропікі Паўднёвай Афрыкі, сустракаецца і ў Азіі, у нас яна таксама расце і прыносіць вялікую карысць. Існуе больш як 100 відаў гэтай расліны і толькі адзін з іх лічыцца лекавым і дэкаратыўным.

У каланхоэ лекавага (пёрыстага) тоўстае мяккае сцябло і такое ж самае лісце, завостранае на канцах. Па краі ліста праходзіць «дарожка» дробных кроплепадобных пасынкаў, напоўненых вільгаццю. Здаровае каланхоэ павінна быць насычанага светла-зялёнага колеру. У хатніх умовах каланхоэ вырастае не больш як 35—50 см.

Сок каланхоэ прадаюць у аптэках, але яго лёгка прыгатаваць і ў хатніх умовах. Свежыя парасткі і лісты здрабняюць, адціскаюць сок, а потым фільтруюць праз марлю. Атрыманы сок прымяняюць для лячэння ранаў, якія доўга не загойваюцца, розных язваў, пры запаленні дзясны і слізістай абалонкі поласці рота, пры лячэнні танзіліту. Добра памятаю, што калі балела горла, бабуля прымушала есці лісты каланхоэ і сок праглытваць. Боль пакрысе сціхаў і, галоўнае, тэмпература зніжалася. Сок каланхоэ — выдатны прафілактычны сродак пры ўзнікненні трэшчын саскоў у кормячых маці.

Пры лячэнні ранаў іх акрапляюць сокам пры дапамозе шпрыца і накладваюць марлевую павязку, шчодра змочаную сокам. Павязку мяняюць штодня, потым праз дзень. Адзін раз на дзень дадаткова змочваюць сокам ніжнія слаі марлі, зняўшы верхнія. Сярэдняя працягласць курса лячэння 15—20 дзён.

Пры стаматытах да дзясны на 10 хвілін прыкладваюць жгуцікі з ваты, змочаныя сокам. Паўтараюць 3-4 разы на дзень.

Дапамагае сок каланхоэ пры апёках і траўмах.

Дарэчы, вырошчваць каланхоэ ў сябе дома карысна не толькі таму, што ім можна лячыцца. Гэтая расліна паглынае ўсе шкодныя выпраменьванні, якія назапашваюцца ў пакоях у выніку карыстання электрабытавой тэхнікай. Асабліва карысна ставіць вазоны з каланхоэ побач з тэлевізарам. Паглынаючы ўсе шкодныя выпраменьванні, расліна назад іх не выпускае дзякуючы асабліваму рэчыву, якое пакрывае яе і не дазваляе выпарацца вільгаці.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар

ЗВЯЗДА 13 лістапада 2008 г.

«РОБІМ ЗВЫЧАЙНУЮ СЯЛЯНСКУЮ СПРАВУ»

ЗАТ «1 Мая» Нясвіжскага раёна

З выдатнымі вынікамі сустракаюць сваё прафесійнае свята — Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрmaпрамысловага комплексу — працаўнікі закрытага акцыянернага таварыства «1 Мая» Нясвіжскага раёна. І пра гэта будзе расказана ніжэй. А вось у самой гаспадарцы да сваіх сёлетніх дасягненняў ставяцца, скажам так, без лішняй помпы.

— Так, папрацавалі нядрэнна, неблагі ўраджай збожжавых сабралі. Але ж у нашым раёне ёсць і лепшыя: агракамбінат «Сноў», СВК «Грыцкевічы», саўгас «Друцкаўшчызна»... Мы ў раёне па ўраджайнасці — толькі чацвёртыя, — гаварыў дырэктар ЗАТ «1 Мая» Анатоль Рудзяк, называючы больш годныя, на яго погляд, адрасы. А потым дадаў:

— А ўвогуле, усе мы робім звычайную сялянскую справу. Нялёгкую, хоць і вельмі ганаровую, як нярэдка кажуць пра яе. І сапраўды — ганаровую: будзе хлеб, будзе ўдосталь іншай сельскагаспадарчай прадукцыі — будзе ў нашага чалавека і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Пра святочныя падарункі і інш.

У «1 Мая» па сакрэце паведамілі: ідзе актыўная падрыхтоўка да яшчэ аднаго свята сельскіх працаўнікоў — прафесійнага, якое адзначаецца ў гэту нядзелю. Пры гэтым камплектуюцца святочныя падарункі, у якія ўваходзяць каўбасы, кансервы, масла, цукар і іншыя вельмі прыемныя рэчы. А яшчэ, прыгадаем, у «1 Мая» прынята рабіць ад гаспадаркі падарункі і да навагодняга свята... Сёй-той з гараджан, чытаючы пра гэта, падумае: «Вось дык жыццё!».

Ды як тут сказаць. Праца ў вяскоўцаў вядома якая — напружанаяя. І ўстаць трэба рана, і позна легчы. А заробкі?

Яны не такія ўжо і вялікія ў сельскіх працаўнікоў. Пры гэтым у «1 Мая» даводзяць: у іншых краінах даход ад сельскагаспадарчай прадукцыі размяркоўваецца прыкладна наступным чынам: 75 працэнтаў — непасрэднаму вытворцу, астатняе — перапрацоўшчыку і гандляру. Але далёка не так гэта ў нас.

Аднак першамайцы на сваё жыццё не наракаюць. І, напэўна, мала хто з іх пагадзіўся б змяніць гэта жыццё на гарадское. Год ад году прыгажэюць, становяцца больш добраўпарадкаванымі вёскі, якія размешчаны на тэрыторыі гаспадаркі. Падчас нашага візіту сюды ў вёсцы Салтанаўшчына ішлі маштабныя земляныя работы: да дамоў яе жыхароў пракладвалі газ. У дамах — усе астатнія зручнасці; тут жа, непасрэдна ў вёсцы, — усе неабходныя аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння... У гаспадарцы сёлета будзе ўведзена 12 новых жылых індывідуальных дамоў... І, па сутнасці, устройваюць гэта жыццё першамайцы сваімі ж рукамі. Сваёй працай.

З прафесійным святам вас, працаўнікі «1 Мая», усе іншыя працаўнікі сельскай гаспадаркі!

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 600032170

Пра кантрольную лічбу галоўнага аграномa

Нашым гідам па гаспадарцы быў галоўны аграном Мікалай Ленкавец. Яшчэ некалькі гадоў таму была ў яго так званая кантрольная лічба, якую ён намеціў: мець у гаспадарцы з гектара ў сярэднім 60 цэнтнераў збожжавых. І гэта лічба ўжо раней падпарадкоўвалася працаўнікам «1 Мая», а сёлета тут узялі з гектара ажно па 75,7 цэнтнера, дасягнуўшы ў выніку проста неверагоднай для сябе вышыні. Больш за тое: на асобных участках першамайцы атрымалі нават да 100 цэнтнераў з гектара. А гэта ўжо ўвогуле за межамі нашых звычайных уяўленняў аб сельскагаспадарчай справе; лічбы — проста фантастычныя. Для недасведчаных варта патлумачыць: яшчэ не ў такім далёкім мінулым рэкорднымі ў сельскіх працаўнікоў лічыліся ўраджаі па 30 цэнтнераў з гектара... Пры ўсім гэтым варта таксама адзначыць: хоць зямля ў гаспадарцы «1 Мая» ў цэлым і нядрэнная, яе ўрадлівасць складае 39—43 балы, але і не самая лепшая ў раёне; увогуле — яе не аднясеш да той зямлі, пра якую вяскоўцы часам так кажуць: на хлеб можна намазваць. Словам, справа тут, хутчэй, не ў зямлі. Тады ў чым жа?

Аднак паслухаем на гэты конт галоўнага агранома. Прычым тут жа зазначым: літаральна праз некалькі месяцаў ён будзе адзначаць сваё 60-годдзе, а таксама святкаваць своеасаблівы юбілей — 40 гадоў «аграномiцы» ён на зямлі; з 1975 года працуе непасрэдна ў гаспадарцы «1 Мая». Пра тое, як ён вядзе сваю клапатлівую справу, няблага сведчаць тыя ж лічбы. Нягледзячы на свой ужо немалады ўзрост, Мікалай Міхайлавіч можа даць добрую фору любому маладому. Ён «трымае» выдатную форму і, па сутнасці, з раніцы да позняга вечара матляецца на сваім добра пашарпаным ГАЗіку па неабсяжных палях гаспадаркі (а яны расцягнуліся на 22 кіламетры ўдаўжыню ды на 8—9 ушыркі). «Мой рабочы кабінет — гэта поле», — так і зазначыў падчас адной з ранейшых сустрэч Мікалай Ленкавец.

— Яшчэ паслужыце? — спытаўся ў яго цяпер.

— Паслужу, калі не папросяць...

Застаецца дадаць: толькі ГАЗік вытрываў бы, усё ж такі не чалавек, а жалеза...

Аднак паслухаем нарэшце Мікалая Міхайлавіча пра сёлетнія раслінаводчыя вынікі гаспадаркі і пра тое, як дабіваліся гэтых вынікаў.

* * *

Галоўная мэта раслінаводчай галіны гаспадаркі — забеспячэнне яе жывёлагадоўлі паўнацэннымі высакаякаснымі кармамі, вытворчасць малака і мяса — гэта асноўны накірунак дзейнасці першамайцаў, прычым статак у іх — адзін з найвялікшых як у раёне, так і ў вобласці, больш за 7 тысяч галоў у ім. Адпаведна, і тое ж збожжа пераважна ідзе на кармавы рацыён для жывёлы. Сёлета было пасеяна збожжавых на плошчы 1950 гектараў; па 550 гектараў занялі пад азімыя жыта і пшаніцу, 810 — пад ячмень, 40 — пад авёс. І ўсё было зроблена для таго, каб атрымаць максімальны ўраджай: правялі своечасовую сяўбу ўсіх азімых і яравых, унеслі дастатковую колькасць мінеральных угнаенняў — з разліку 430—450 кілаграмаў дзеючага рэчыва на гектар (гэта ў сярэднім, канкрэтна ж — арыентаваліся на пэўную патрэбнасць у мінеральнай падкормцы пэўнай культуры і на свае так званыя картаграмы), яшчэ восенню ўнеслі каля 9 тысяч тон арганічных угнаенняў. І наступны вельмі важны момант: на гэты сезон пераважная частка поля пад азімую пшаніцу была засеяна вельмі высокапрадукцыйным гатункам «кубус», які і даў тыя ж 100 цэнтнераў (насенне гэтага гатунку купілі за мяжой яшчэ раней, размножылі яго ў гаспадарцы). У выніку ўсяго гэтага і атрымалі тую ж небывалую ўраджайнасць, у цэлым жа сабралі збожжавых каля 14 800 тон (летась было 9450).

Цукровыя буракі — наступная стратэгічная культура гаспадаркі, прычым за кошт іх яна ўжо толькі зарабляе — у прыватнасці, прадае іх на Гарадзейскі цукровы завод. У гэтым годзе ў «1 Мая» атрымалі таксама рэкордны ўраджай іх — каля 500 тон з гектара знялі; даведзенае заданне па бураках — 16 500 тон, сабралі ж каля 22 тысяч (заданне ўжо выканалі, пры гэтым немалая частка прадукцыі пакуль што захоўваецца ў гаспадарцы ў буртах, Гарадзея не паспявае прымаць). За кошт чаго ўтварыўся такі важкі «лішак»? Тут таксама адыгралі сваю ролю належная падрыхтоўка поля пад пасевы, своечасовае і дакладнае захаванне ўсіх агрaпрыёмаў, элітнае насенне.

Запас, або той жа «лішак», кішэню не цягне... Гэткага ж прынцыпу ў гаспадарцы прытрымліваліся і пры нарыхтоўцы кармоў для сваёй жывёлы на зімовы стойлавы перыяд. Пры планах нарыхтоўкі сенажу 10 808 тон і сіласу 17 100 тон — нарыхтавалі значна болей. Прычым, як падкрэсліваў Мікалай Ленкавец, увесь сілас — кукурузны, г. зн. найбольш каштоўны. Для таго каб атрымаць належную колькасць зялёнай масы, пасеялі кукурузы на плошчы 880 га, прычым 200 га адвялі пад зерне. Уборку кукурузы на зерне якраз і рабілі ў гаспадарцы (дакладней — заканчвалі) падчас нашага візіту ў яе. «Пазнавата ўбіраем, але ж чакалі, пакуль зерне дойдзе да належнай кандыцыі. Год быў мокры, кукуруза доўга расла, думалі, што зерня ўвогуле не будзе. Але разлічваем па 80 цэнтнераў з гектара атрымаць, хоць у лепшыя гады было і па 120», — гаварыў Мікалай Ленкавец, нібы апраўдваючыся і за тэрміны, і за сёлетні недабор зерня. Навошта гаспадарцы зерне кукурузы? Для сваёй жа ўласнай кормавытворчасці, для прыгатавання свайго камбікорму (што тут таксама добра наладжана), для належнага балансавання кармавога рацыёну жывёлы, лепшага забеспячэння яе бялкамі (кукуруза, як вядома, высокабялковая культура). Дарэчы, сеюць яе ў гаспадарцы таксама з высокаэлітнага насення, або, як падкрэслівае галоўны аграном, з гібрыднага насення першага пакалення, якое купляюць у Францыі.

Мікалай Ленкавец называў таксама немалыя лічбы нарыхтаваных кармавых адзінак на «ўмоўную галаву», але, можа, ужо і хопіць лічбаў. Ужо і без іх добра зразумела: жывёлу ў «1 Мая», як заўсёды, чакае сытная зімоўка, пра гэта тут добра паклапаціліся. Больш красамоўны наступны факт: на зімнестойлавы перыяд у гаспадарцы маюць двайны запас кармоў; тут яшчэ не распачаталі сіласныя ямы, якія залажылі ў мінулым годзе...

Зразумела, добрыя кармы — добрае малако і мяса. У гаспадарцы сёлета за 10 месяцаў ад кожнай каровы надаілі больш чым па 5800 кілаграмаў малака (можна чакаць, што за год будзе каля 7 тысяч), маюць сярэднясутачныя прывагі на адкорме па 750 грамаў. Адпаведна, добрыя мяса і малако паступаюць ад першамайцаў на перапрацоўчыя прадпрыемствы, важкі, добра заўважны ўклад робяць працаўнікі «1 Мая» ў харчовае забеспячэнне краіны.

Не расслабляцца

Нялёгка дасягнуць добрай вышыні, яшчэ цяжэй стартаваць з гэтай вышыні ў наступным сезоне. Гэта добра разумеюць у «1 Мая». І, як заўсёды, ухіл робяць на перадавыя агратэхналогіі, на захаванне аптымальных агратэрмінаў і аграномаў, на насенную базу ды на самую сучасную высокапрадукцыйную тэхніку (стаўка на гэтыя накірункі была некалі зроблена яшчэ ранейшым кіраўніком Ігарам Макарам). Некалі ў «1 Мая» вельмі захапляліся сваім імпартным кормаўборачным камбайнам «Ягуар» — сёлета тут з'явіўся намнога больш магутны і больш прадукцыйны «Бігс». Папоўніўся ў гаспадарцы парк прычапной высокаэфектыўнай тэхнікі, тут таксама набылі фінскую каменеўборачную машыну (а на камяні, дарэчы, таксама не паскупілася зямля, якая знаходзіцца ў распараджэнні гаспадаркі). У бліжэйшых планах — набыццё новага камбайна па ўборцы цукровых буракоў, не спраўляецца з іх уборкай, не спраўляецца з іх ураджаем нямецкі камбайн «Кляйнэ», які ёсць у гаспадарцы, хоць і мае неблагую прадукцыйнасць. Даводзіцца арандаваць у суседзяў дадатковы камбайн, а за кожны ўбраны гектар трэба выкласці 650 тысяч рублёў... «Налета плануем набыць камбайн «Холмер», — зазначае Мікалай Ленкавец. — Гэта вельмі высокапрадукцыйная машына, а галоўнае — у ёй усе рабочыя органы, або капачы, працуюць аўтаномна, што дазваляе ім на кожным радку буракоў дакладна капіраваць мясцовасць. У выніку вельмі чыстая ўборка атрымліваецца...»

Ужо вельмі хутка ў гаспадарцы павінна ўступіць у строй новая малочнатаварная ферма на 600 галоў статку, у якой таксама прадугледжаны самыя сучасныя метады і тэхналогіі догляду жывёлы, што, адпаведна, гарантуе і больш высокія надоі. Побач жа — вялікае поле паступова разведзенай у гаспадарцы высокабялковай кармавой культуры галегі ўсходняй, якая за сезон дае па 3—4 важкія ўкосы зялёнай масы.

— Нам расслабляцца ніяк нельга. Ды і не дазволяць — сталі даволі заўважнымі, — зазначае кіраўнік гаспадаркі Анатоль Рудзяк... Тут жа варта дадаць: першамайцы былі вылучаны як адны з лепшых на раённых і абласных дажынках, а механізатар гаспадаркі Аляксандр Новікаў названы пераможцам на рэспубліканскіх дажынках.

НА ЗДЫМКАХ:

1. Галоўны аграном Мікалай ЛЕНКАВЕЦ (падчас уборкі кукурузы на зерне).

2. Камбайнер Сяргей КАСПЕР і вадзіцель Барыс РУСНАК.

3. Падрыхтоўка поля пад ураджай будучага года. Пры гэтым спецыяльны агрэгат адначасова робіць глыбокае рыхленне глебы, дыскуе яе і прыкачвае. Апрацоўка глебы ў выніку — ідэальная, поле, як зазначаюць у гаспадарцы, роўнае, як стол.

4. На апрацоўцы глебы — механізатар Аляксандр СКРОЦКІ.

5. Механізатары Леанід КРЫМКО, Валерый КАРАЛЕЦКІ і Дзмітрый ТУМАШ.

6. Нямала клопатаў напярэдадні прафесійнага свята сельскіх працаўнікоў у старшыні прафсаюзнага камітэта гаспадаркі Людмілы ПРАКАПЧУК.

7. Ідзе адгрузка цукровых буракоў у Гарадзею.

8. Загадчыца склада Соф'я НОВІК прымае зерне кукурузы на сушку.

9. Так выглядае вуліца з новымі дамамі ў вёсцы Салтанаўшчына.

10. У бухгалтэрыі гаспадаркі: на здымку намеснік галоўнага бухгалтара Галіна МАКАЎЧЫК, галоўны бухгалтар Марына ЧАРНЯЎСКАЯ і бухгалтар Ганна ДЫЛЕЎСКАЯ.

Фота Аляксандра КРЭНЦЯ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.34	16.13	8.39
Віцебск —	7.29	15.58	8.29
Магілёў —	7.24	16.03	8.39
Гомель —	7.15	16.06	8.51
Гродна —	7.48	16.29	8.41
Брэст —	7.43	16.36	8.53

Месяц

Поўня.

Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Сяргея, Усевалада, Якава.*

К. *Валянціны, Станіславы, Хрысціны, Аркадзя, Мікалая, Станіслава.*

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

13 лістапада

1918 год — у сувязі з рэвалюцыяй у Германіі выйшаў Дэкрэт Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта аб ануляванні Брэсцкага мірнага дагавора, які падзяліў Беларусь па лініі Дзвінск — Свянцяны — Ліда — Пружаны — Брэст.

1939 год — правaліліся савецка-фінскія перагаворы ў Маскве, пасля чаго Сталін аддаў загад пачаць падрыхтоўку да вайны.

Цытата дня:

«Часам тое, чаго мы баімся, меніш небяспечнае, чым тое, чаго мы жадаем».

Джон Чэртан Колінз (1848—1908), англійскі крытык.

ВОЎК

Воўк у народнай культуры мае падвоеную сімволіку: з аднаго боку ён увасабляе зло і жорсткасць, а з другога — мужнасць, перамогу і клапатлівасць пра сваіх нашчадкаў. Шматлікія апавяданні пра вядзьмарак, якія пераўтварыліся ў ваўчыц, і пра мужчын, якія сталі ваўкамі-ваўкалакамі, надалі гэтай жывёліне магчымасць сувязі з «тым», д'ябальскім, светам. Аднак у духоўнай спадчыне старажытных скандынаваў ці грэкаў воўк — татэмная жывёла і сімвал непераможнасці, а ваўчыца, якая выкарміла Ромула і Рэма — заснавальнікаў Рыма, стала сімвалам пяшчотнай мацярынскай любові і ахвярнасці (для параўн.: для беларусаў татэмнай жывёлай лічыцца мядзведзь).

● У славянскіх народаў вобраз ваўка звязаны з пераходнымі, памежнымі, пераломнымі момантамі: смерцю (ён суправаджае душы ў паслясмяротным жыцці); вяселлем («ваўком» называлі жаніха, які прыехаў знайсці сабе «цялушку» ці «авечку»); з некаторымі каляндарнымі датамі (Каляды — запрашэнне продкаў у выглядзе ваўка за святочны калядны стол); з «пераходнымі» зімовым ці вясновым перыядамі.

● Драпежная жывёліна — воўк — заўсёды пагражае чалавеку і яго хатняй гаспадарцы. Воўк — хітры, каварны, можа загрызці ўвесь статак, з якога ў спажыванне возьме 1-2 жывёліны. Суцішыць ваўка мог цудадзейным спосабам толькі Георгій Перамаганосец — «воўчы пастар»: «што ў ваўка ў зубах — то Ягорый даў».

● Аднак у славянскага народа смелы і разумны воўк, акрамя страхаў, выклікае сімпатыю. У казках пра Івана Царэвіча шэры воўк становіцца станоўчым персанажам — можа размаўляць, вельмі мудры, мае крылы, з дапамогай якіх можа пераляцець з аднаго свету ў другі. Так здавён вялося — калі дарогу перабяжыць воўк, гэта прынясе шчасце (у адрозненне ад лісы, вавёркі ці зайца).

● Згодна з народнымі ўяўленнямі, з ваўком можна заўсёды знайсці агульную мову, калі звярнуцца да яго з добрым словам: «Добрыя моладцы! Вам свой бок, мне свой». Воўк ніколі не кране вандроўніка ці хатнюю жывёлу, калі перад дарогай ці перад выганам хатняй жывёлы ў поле прачытаць замову.

● Існавала пэўная сімвалічная сувязь паміж ваўком і прыладамі ткацтва. На кроснах ткалі «абярэгі» ад нападу ваўкоў. Паўсюдна апісаны выпадкі нападаў ваўкоў на тых, хто пераносіў прылады ткацтва з адной вёскі ў другую, не выканаўшы пры гэтым пэўных ахоўных дзеянняў.

● Паводле народных павер'яў, ваўка пужаюць полымя і званы. Таму на вупраж коням заўсёды вешалі шмат званочкаў.

● Перад тым, як жывёлу першы раз выганялі ў поле, выконвалі цэлы шэраг магічных дзеянняў, накіраваных у першую чаргу на тое, каб засцерагчы яе ад зубоў ваўка: абносілі жывёлу чацвяровай соллю, грамнічнай соллю, святой хрышчэнскай вадой, спасавым макам, чыталі малітвы і замовы.

● Моцным абярэгам статку ад ваўка лічылася яйка, знесенае чорнай курыцай.

● У народзе лічылі: калі ваўкі падыходзілі зусім блізка да хат, збіраліся зграямі і вылі — чакай халадоў і няўроду, вайны ці іншых няшчасцяў.

● Пачынаючы з 9 снежня (дзень святога Юрая, які ў народзе носіць назву халодны), ваўкі пачынаюць падыходзіць да людскіх паселішчаў, і таму небяспечна пакідаць вёску.

● Перыяд з 22 снежня (дзень святой Ганны) і да 19 студзеня (Хрышчэнне) у народзе называлі воўчымі святамі або вяселлямі. У гэты час ваўкі збіраюцца ў зграі і становяцца вельмі небяспечнымі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Маладая жонка плачацца маці:

— Прыгатавала я, матуля, пірог свайму мужу, ды такі прыгожы, мяккі, як вата! А ён пакаштаваў, ды як стукне мяне гэтым пірагом у плечы — быццам каменем!

☺

У Ціхім акіяне знайшлі гібрыд акулы і залатой рыбкі. Выконвае тры апошнія жаданні...

☺

— А я вось са сваім футбол гляджу! Ужо 4 каманды вывучыла: «Спартак», «Зеніт», «прынясі піва» і «падай газету»...

☺

...Было ў старога тры...

Дык не — за чацвёртай пабег!

☺

Урок хіміі ў школе:

— Маша, якога колеру атрымаўся твой раствор?

— Чырвонага.

— Малайчына, пяць. А ў цябе, Пеця?

— Фіялетавага.

— Добра, чатыры. А ў цябе, Вовачка?

— Чорнага, Марванна.

— Вовачка, два! Клас, лажыся!!!